НЯДЗЕЛЯ, 10 ВЕРАСЬНЯ 1933 г. № 209

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ.

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

Адрас рэдакцыі і канторы: г. Віцебск, пляц Волі, Палац працы, трэці паверх.
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА 2 р. у мес.
Цана асобн. нумару 8 кап.

Тэлефоны рэдакцыі: Сакратарыят—1-73; нам. рэдактара, партыйны і масавы сэктары—4-76; сэктары прамысловы, сельска гаспадарчы—72; рабоч. снабжэньня і капэрацыі, сан. будаўніцтва, нац. культурнага будаўніцтва—6-15; Аістоў рабочых і калгаснікаў, бюро расьсьледаваньня—2-00; кантора—55; начная рэдакцыя—4-46.

ОРГАН ВІЦЕБСКАГА ГАРКОМУ КП(б)Б, ГАРСАВЕТУ І ГАРПРАФСАВЕТУ.

СЕНЬНЯ Ў НУМАРЫ:

Старшыня ЦВК СССР тав. М. І Калінін у Менску.

Аб ходзе ўборкі яравых па калгасах і аднаасобным сэктары. Пастанова бюро ГК КП(б)Б.

Пераходны сьцяг гаркома партыі і гарсавета за лепшае выкананьне сельска гаспадарчых работ перададзен Міхалёўскаму сельсавету.

УДЗЕСЯЦЯРЫЦЬ ЭНЭРГІЮ КОЖНАГА БАЛЬШАВІКА, КАЛГАСЬНІКА І ПРАЦОЎНАГА АДНААСОБНІКА Ў БАРАЦЬБЕ ЗА ЎБОРКУ ЎРАДЖАЯ, УЗМАЦНЕНЬНЕ ТЭМПАЎ АБМАЛОТУ І ЗБОЖЖАЗДАЧЫ, СЯЎБЫ!

Міхалёўскі сельсавет за лепшыя паказальнікі с.-г. работ атрымаў пераходны сьцяг гаркома КП(б)Б і гарсавета. Справа гонару кожнага сельсавету, калгасу—бальшавіцкай работай дамагацца сацыялістычнага пяршынства ў раённым конкурсе!

Аб ходзе уборкі яравых па калгасах і аднаасобным сэктары.

Пастанова бюро Віцебскага гаркому КП(б)Б ад 7 верасьня 1933 г.

Ход уборкі яравых па калгасах і аднаасобнаму сэктару ідзе злачынна марудными тэмпамі. На 5 верасьня скошана яравых 46,8 проц., зьвезена з поля 55,7 проц. скошанага. Значная колькасьць хлеба знаходзіцца ў валках і прарастае. Такое становішча з уборкай чрезвычайна вялікімі стратамі і стварае яўную пагрозу гібелі ўраджаю. Замест бальшавіцкай барацьбы за ўраджай, мы маем у ячэйках, саветах, калгасах, каапгасах, сярод камандыраваных гаркомам на вёску камуністаў на ўборачную кампанію дэмабілізацыйныя, самацёчныя, апартуністычныя настроі (надзея на добрае надвор'е) і адсутнасьць усякай работы па мабілізацыі мас калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў на бальшавіцкую барацьбу са стратамі, за выратаваньне калгаснага ўраджаю, выкарыстоўваючы багацейшы вопыт работы ў сельскай гаспадарцы мас калгаснікаў на выкананьне гэтай важнейшай задачы. Сельскія партарганізацыі не разумеюць, што справа ідзе зараз не аб звычайнай уборцы ўраджаю, а аб яго выратаваньні. Гэта патрабуе падвесяцярэнай энэргіі кожнага бальшавіка, кожнага калгасьніка, працоўнага аднаасобніка ў барацьбе за ўраджай, памятаючы, што страта кожнага кілёграма збожжа, кожнага каласка зьяўляецца вялікім злачынствам перад партыяй, пралетарскай дзяржавай і работнічай клясай, і задача партарганізацыі заключаецца ў стварэньні ў кожным калгасе, сярод працоўных аднаасобнікаў баявога настрою, трывогі ў барацьбе за ўраджай, рашуча вядучы барацьбу з клясавым ворагам—кулаком, лодырам, падкулачнікам, якія ставяць стаўку пагібіць калгасны ўраджай, і з агентамі клясавага ворага—кулака—правымі апартуністамі, якія ставяць стаўку на самацёк у рабоце.

Бюро гаркому лічыць неабходным прыняць наступныя тэрміновыя практычныя меры ў барацьбе за ўраджай:

1. 8 верасьня ва ўсіх сельсаветах склікаць нарады старшынь калгасаў, брыгадзіраў, ударнікаў калгаснікаў, камандыраваных гаркомам камуністаў на ўборачную кампанію для абгаварэньня пытаньняў, зьвязаных з уборкай ураджаю, з правядзеньнем сяўбы і са здачай дзяржаве добраякаснага збожжа.

2. Камандыраваць для правядзеньня гэтых нарад і арганізацыі сельска-гаспадарчых работ наступных членаў бюро і членаў гаркому: КОНІКАЎ, ГАЛАВЕНАК—Віцебскі сельсавет, РОХЛІНД, КУЗЬНЯЦОЎ—Ялагінскі, ЖУРАЎЛЕЎ, ТУЧЭНКА—Рудніцкі, БАШМАЧНІКАЎ—Рудакоўскі, БАСКІН, КВІНТА—Даўжанскі, ГАЛУЗА, РАЗУМОЎСКІ—Нікалаеўскі, МОІН, ЖЭРНОСЕК—Старасельскі, КАВАЛЁЎ, ШУБІН—Замастоцкі—ЧАРНЕЦКІ, ФАМІН—Машканскі, ГАЎРЫЛЬЧЫК—Бабініцкі, СІМАНОЎСКІ—Бараўянскі, ЗІНОЎЕЎ—Шумнянскі, АРДЗІНЦОЎ, БАНДАРЭНКА—Міхалёўскі, ШЫНДЛЕР, ЮДЗІН—Вяліка Лётчанскі, ДРАГУН, КУПФЭРБЭРГ—Сялюцкі.

3. 9 верасьня правесьці ва ўсіх калгасах сходы калгаснікаў, сходы аднаасобнікаў па дзесяцідворках па пытаньнях уборкі ўраджаю, асеньняй сяўбы і здачы дзяржаве добраякаснага збожжа. Намеціць на гэтых сходах канкрэтныя меры па ўборцы, прасушцы хлеба, па барацьбе са стратамі, уважліва ўлічыць усе прапановы калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў, накіраваных на хутчэйшае правядзеньне ўборкі, на барацьбу са стратамі, на захаваньне калгаснага ўраджаю. Абгаварыць і вынесьці канкрэтныя меры па правядзеньні ў жыцьцё рашэньняў ЦК КП(б)Б аб уборцы, асеньняй сяўбе і разьмеркаваньні даходу у калгасах.

4. У якасьці практычных мер рэкамэндаваць:

а) неадкладнае кашэньне ўсяго пасьпеўшага хлеба (ячменя, аўсу, вікі), зьвязваньне хлеба ўсьлед за кашэньнем маленькімі і спопікамі, прасушваньне хлеба на сёнах, у сараях, на сквазьняках, на астраўках і г. д.

б) арганізаваць кругласутачную малацьбу збожжа ўсімі малатарнямі, здачу добраякаснага, прасартаванага, сухога (ня вышэй 17 проц. вільготнасьці) збожжа дзяржаве;

в) арганізаваць падрыхтоўку глебы, ўгнойваньне яе і сяўбы азімых з такім разьлікам, каб у пацідзённы тэрмін скончыць асеньнюю сяўбу. Пераключыць для гэтай работы ня менш 75 проц. усяго цягла і ўсе трактары, вольныя ад малацьбы, а там, дзе ёсьць магчымасьць перавесьці малатарні на электрычную цягу, трактары выкарыстаць на ворыве. Забараніць сяўбу на добраякасным, неадсартаваным вернем, прыцягваючы вінаватых у парушэньні гэтай дырэктывы да судовай адказнасьці;

г) арганізаваць у кожным калгасе групы калгаснікаў па цераблёньні ільну і па яго расьціліу ў такой колькасьці, каб у бліжэйшыя дні скончыць цераблёньне і расьціл ільну, ня зрываючы іх (групы) з гэтай работы да канца ўборкі ільну. Арганізаваць усьлед за цераблёньнем адлучэньне галовак ад валакна, прасушку галовак, іх малацьбу і неадкладны расьціл ільну;

д) бюро гаркому лічыць вусім недапушчальным слабае паступленьне збожжа ў лік натураплаты МТС і ў лік пагашэньня насеннавычкі і папярэдняе ўсе ячэйкі, саветы, калгасы, дырэктара МТС і ўпаўнаважаных гаркома, што гарком будзе прымаць рашучыя меры партыйнага спагнаньня да тых, якія лічаць, што натураплату будуць здаваць пасьля выкананьня збожжапаставак па абавязацельствах, як да антыдзяржаўнікаў і абавязвае неадкладна праверыць і вытлумачыць прычыны невыкананьня з боку асобных калгасаў паставак хлеба па натураплаце і вінаватых прыцягнуць да адказнасьці;

е) адзначаючы адставаньне аднаасобнікаў у хлебаздачы, гарком абавязвае саветы, упаўнаважаных гаркому праверыць выкананьне кожным аднаасобнікам абавязацельстваў перад дзяржавай па хлебаздачы і тых, якія не выканаюць гэтыя абавязацельствы, прыцягнуць да адказнасьці на аснове закона аб збожжапастаўках, разгарнуўшы шырокую масава-арганізацыйную работу за датэрміновую здачу дзяржаве збожжа;

ж) абавязаць асабіста старшынь саветаў, упаўнаважаных гаркому партыі праверыць выкананьне збожжапаставак кулакамі і цьвёрдазаданьнікамі і тых, якія ня выконваюць сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай, прыцягнуць да адказнасьці з тым, каб выканаць плян збожжапаставак па кулацкіх гаспадарках да 15 верасьня, а па бульбе да 1 кастрычніка;

з) бюро гаркому зьвяртае асаблівую ўвагу на якасьць правазімай уборкі, абмалоту і асеньняй сяўбы, абавязвае ўсе калгасы стварыць камісіі па якасьці, задачай якіх паставіць сачыць, каб віводзін каласоў не застаўся на полі, за добраякасным абмалотам, сачыць, каб не прарастала і не загравалася збожжа ў копах, бабках і сьвірнах, сачыць, каб сяўба праводзілася добраякасна, адсартаваным, праверанным на ўсхожасьць збожжам, сачыць, каб праводзілася добрае заделваньне засеянага збожжа і не парушаўся севазварот. На ядобраякасную работу камісіі па якасьці павінны складаць акты і вінаватых прыцягваць неадкладна да стражэйшай адказнасьці.

Гарком лічыць, што партарганізацыі ў вёсцы зразумеюць усю адказнасьць моманту ў барацьбе за ўраджай і забясьпечаць бальшавіцкай работай яго ўборку без страт. Да тых, якія дапусьцяць самацёк у рабоце, бюро гаркому вымушана будзе прычыніць рашучыя меры партыйнага і судовага ўзьдзейнічаньня.

Сэкратар ГК КП(б)Б ЖУРАЎЛЁЎ.

АБ ПРЫСУДЖЭНЬНІ ПЕРАХОДНАГА СЬЦЯГА ГК КП(б)Б і ГАРСАВЕТА.

Пастанова бюро гаркому КП(б)Б.

1. Прысудзіць пераходны сьцяг ГК КП(б)Б і гарсавета Міхалёўскаму сельсавету (старшыня сельсавету т. Шапкоўскі), які дабіўся ў параўнаньні з іншымі сельсаветамі лепшых паказальнікаў ў выкананьні чарговых гаспадарча палітычных кампаній (уборка азімых—103 проц., ячменю—91 проц., аўсу—89 проц., ільну—75 проц.; сяўба азімых: калгасы—45 проц., аднаасобнікі—30 проц.; збожжапастаўкі: калгасы—64 проц., аднаасобнікі—24,7%), адначасова зьвярнуўшы ўвагу сельсавету на рэзкае адставаньне аднаасобнага сэктару па сяўбе і асабліва па збожжапастаўках.

2. Аспарваючымі пераходны сьцяг ГК КП(б)Б і гарсавета зьяўляюцца Ялагінскі (старшыня т. Паўлючэнка, упаўнаважаны ГК КП(б)Б т. Абелеў), Машканскі (старшыня т. Астапаў і ўпаўнаважаны ГК КП(б)Б т. Фамін) і Вяліка Лётчанскі (старшыня т. Когаль) — сельсаветы, якія маюць у апошні час некаторыя зрухі ў збожжапастаўках і сяўбе.

3. Адзначыць, што ўключэньне сельсаветаў, калгасаў, брыгад у конкурс у сваёй большасьці шчэ не замацавана сапраўдным, пагодзённым разгортваньнем сацспаборніцтва і перанасеньнем вопыту работы лепшых калгасаў, брыгад і ўдарнікаў на адстаючыя вучасткі, што ў радзе выпадкаў маецца славесная дэкларацыйнасьць (Рудакі, Замасточча, Рудніцы, Доўжа) замест сапраўднага разгортваньня сацспаборніцтва.

Даручыць сельскім саветам, ячэйкам, упаўнаважаным ГК КП(б)Б праверыць ход спаборніцтва, канкрэтнасьць абавязацельстваў, узятых на сябе калгасамі пры ўключэньні ў конкурс і ўстанавіць праверку іх выкананьня.

4. Папярэдзіць Міхалёўскі, Машканскі, Вяліка-Лётчанскі і Ялагінскі сельсаветы, што толькі ў результаце штодзённай, сапраўды бальшавіцкай барацьбы за ўборку, сяўбу і збожжапастаўкі яны змогуць замацаваць тыя зрухі, што намеціліся ў іх працы, і дабіцца пяршынства, якое павінна аспарвацца ўсімі сельсаветамі раёна.

5. Пытаньне аб прысуджэньні пераходнага сьцягу перадаць на бюро ГК КП(б)Б 15 верасьня 1933 г.

Сэкратар ГК КП(б)Б ЖУРАЎЛЁЎ.

Неадкладна ўзяцца за малацьбу аўсу.

Калгас імя Гамарніка, Ялагінскага сельсавета зжаў 7,29 га аўсу, зьвёз з поля 2,30 га тыдзень таму назад, але яшчэ ня прыступіў да малацьбы. Калгас павінен здаць дзяржаве 19,55 цэнтнераў аўсу, і гэта ён можа зрабіць пры ўмове абмалоту зжатага аўсу.

Старшыня калгасу ДАВІДОВІЧ лічыць, што зараз на малацьбу нельга адрываць коняй, раней трэба скончыць сяўбу.

У гэты-жа час ў брыгадзе № 2 восем коняй гуляюць ужо тры дні.

Пара пакончыць з апартуністычнай стаўкай на «чарговасьць» у сельска гаспадарчых працах. Калгас мае ўсе магчымасьці сеяць і адначасова частку коняй кінуць на малацьбу. А.

Старшыня ЦВК СССР М. І. Калінін у Менску.

МЕНСК, 8. 7 верасьня ў Менск прыехаў старшыня ЦВК СССР М. І. Калінін. На вагзале Міхаіла Іванавіча сустракалі кіраўнікі партыйных, савецкіх і дэлегацыі рабочых арганізацый.

А 7 гадз. вечара на спэцыяльна скліканым пашыраным пленуме менскага гарадзкога савету т. Калінін выступіў з вялікім дакладам аб міжнародным і ўнутраным становішчы СССР.

Уборка яравых збожжавых і азімай пшаніцы па калгасна-сялянскім сэктары на 5 верасьня.

(У процантах)

СЕЛЬСАВЕТЫ	Зжата	Зьвезена да зжатага	Абмалочана да зжатага
Міхалёўскі	71	57,8	20,5
Вяліка-Лётчанскі	67,4	69,8	11,6
Машканскі	64,3	61,9	20,8
Бабініцкі	54,3	52,7	13,5
Замастоцкі	51,4	50,4	14,8
Бараўлянскі	50,9	44,8	15
Ялагінскі	50,5	54,1	34 1
Віцебскі	50	60,7	24,3
Сялюцкі	44,8	69,3	15,2
Шумнянскі	43	70,4	17,6
Міхалёўскі	40,6	46,9	28,7
Старасельскі	39,4	52,7	8,5
Рудакоўскі	31,9	61,6	17,7
Рудніцкі	26,9	25,8	14,6
Даўжанскі	23	38,4	16,5
Разам	46,8	55,7	18,7

Ячменю зжата 3493,3 га, аўсу—2890,5 га, бабовых—158,5 га, пшаніцы азімай—318,2 га, жыта яравога—280,2 га, пшаніцы яравой—267,8 га, вікі на насеньне скошана—200,6 га.

Зьвезена з палёў ячменю 2810,7 га, аўсу 406,8 га, азімай пшаніцы 290,9 га, яравога жыта 231,8 га, яравой пшаніцы 109,5 га, вікі на насеньне 119,9 га.

Абмалочана ячменю 1070,6 га, аўсу 41,5 га, бабовых 3 га, пшаніцы азімай 197 га, жыта яравога 30,4 га, пшаніцы яравой 7,55 га. Віка не абмалачвалася.

Аб фактах сабатажу і змовы супроць чысткі у калектыве шчоткамбінату.

ПАСТАНОВА ГАРАДЗКОЙ КАМІСІІ ПА ЧЫСТЦЫ ПАРТЫІ.

Гаркамісія канстатуе, што пасьля абвяшчэньня вынікаў чысткі партячэйкі воласапрадзільнага цэха шчоткамбінату мелі месца факты шкодніцтва і масавага браку вырабаў экспартнай шчаціны, што зьяўляецца актам сабатажу з боку клясава-варожых і шавіністычных элементаў, маючыхся на фабрыцы, вычышчаных з партыі, і рэзультатам палітычнай блізарукасьці партыкіраўніцтва шчоткамбінату, якое не дало рашучага адпору гэтым элементам.

У сувязі з гэтым гаркамісія пастанаўляе:

1. Прапанаваць ячэйковаму праверкому шчоткамбіната падвергнуць паўторнай чыстцы сакратара ячэйкі воласапрадзільнага цэху т. Лахнову, старшыню цэхкамітэта т. Багарада, інструктара цэха т. Каліша і вычоньваючага абавязкі сакратара парткалектыва т. Лосева.

2. Прасіць рэспубліканскую камісію накіраваць для праходжаньня чысткі на шчоткамбінат дырэктара шчацін. трэста т. Любіна ў сувязі з тым, што т. Любін доўгі час састаяў у ячэйцы шчоткамбінату і не ажыцьцяўляў дастатковага кіраўніцтва шчоткамбінатам.

3. Адзначаючы, што з боку нам. дырэктара па снабжэньні шчоткамбіната Далганскага меўся факт згвору супроць чысткі з ШЭЙМАНАМ—агентам па загатоўках, які выразіўся ў тым, што Далганскі ўгаворваў Шэймана не выступаць адзін супроць аднаго, ВЫКЛЮЧЫЦЬ ДАЛГАНСКАГА З ШЭРАГАЎ ПАРТЫІ, ЯК ДВУРУШНІКА.

Пахаваньне тт. Баранава П. І., Гольцмана А. З., Зарзара В. А., Гарбукова С. П., Пятрова А. П., Дорфмана І. М., Плотнікава В. Е. і Баранавай Б. М.

МАСКВА. 8. Учора ў 3 гадзіны дня бліжэйшыя таварышы і саратнікі па рабоце выносяць з Калённай залі Дома саюзаў труны.

На пляцы перад Домам саюзаў—дэлегацыі ад партыйных, савецкіх, ваенных і прафсаюзных арганізацый і пачэсны ваенны эскорт авіяцыйных часьцей, аэрафлёту, паветранай акадэміі і войск АДПУ. Труны ўстанаўляюцца на чатыры машыны, задрапаваныя ў чырвоную і чорную матэрыю. У перадзе несуць вянкі і рухаецца аўтамабіль поўны вянкоў. Працэсія павольна накіроўваецца на Чырвоны пляц. Непасрэдна за трунамі ідуць члены ЦК і ЦКК УсеКП(б) і ўраду, родныя, сем'і, сябры, саратнікі па рабоце, рабочыя дэлегацыі, вайсковыя часьці, безконцы паток працоўных Масквы, прышоўшых аддаць апошні доўг загінуўшым.

У 3 гадз. 30 мін на Чырвоным пляцы працэсія спыняецца каля маўзалея Леніна. На трыбуне—члены палітбюро ЦК УсеКП(б) і ўраду. Жалобны мітынг адкрывае т. ЕНУКІДЗЕ.

Першым ад Цэнтральнага Камітэта партыі і ўраду выступіў т. В. В. КУЙБЫШАЎ, потым тт. ТУХАЧЭЎСКІ, КАМІНСКІ, ДАЦЭНКА і ОЗОЛ. Прамовай т. Бярозіна заканчваецца жалобны мітынг. Раздаецца здвітальны салют—21 стрэл з гармат. Гукі «Інтэрнацыянала»... Праваджаючыя абнажаюць галовы...

Працэсія павольна рухаецца ў напрамку да крэматорыя.

Разгорнем перадкастрычніцкую пераклічку фабрык і заводаў!

Выклік рабочых і работніц фабрыкі „Дзьвіна“ да ўсіх прадпрыемстваў БССР.

Набліжаецца XVI гадавіна Кастрычніцкай рэвалюцыі гістарычная дата гераічных перамог працоўных Савецкага Саюзу над буржуазіяй і памешчыкамі.

Шлях ад пераможнага Кастрычніка да другой пяцігодкі—пяцігодкі пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва, па якому вядзе і вяла нас камуністычная партыя—гэта шлях няпрымірымых клясавых баёў з нашымі ворагамі, шлях, настомнай барацьбы на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, барацьбы за генэральную лінію нашай партыі, за няўхільнае ажыцьцяўлёньне Ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Зірніце зараз на карту Савецкага Саюзу.. Вы ня знойдзеце ні адной нацыянальнай рэспублікі і вобласьці, дзе-б ня дымяліся фабрычныя трубы, дзе-б ня было школы на роднай для кожнай нацыі мове. Узяць хаця бы нашу Рэспубліку—Савецкую Беларусь. За XVI год яна стала вусім непазнавальнай. З палітычна-эканамічна адсталай акраіны царскай Расіі Беларусь ператварылася ў перадавую індустрыяльна-аграрную краіну.

Замест ранейшых рамесьніцкіх майстэрань, на яе тэрыторыі вырасьлі буйныя гіганты сацыялістычнай індустрыі — мэталапрацоўчыя, дрэвапрацоўчыя і тарфяныя заводы, швэйныя, ільнапрадзільныя, трыкатажныя і запалкавыя фабрыкі, гарбарні, гуты інш.

У вёсцы будуецца зусім новае жыцьцё. Былыя беднякі, забітыя горам і галечай, і середнякі, якія зводзілі канцы з канцамі, уступіўшы на сацыялістычны шлях калектывізацыі, ператвараюцца ў заможных калгаснікаў. Расьце і ўмацоўваецца нацыянальная па форме і пралетарская па зьмесьце культура. Школы, тэхнікумы, ВНУ, ВТНУ, тэатры і кіно—усё гэта па сутнасьці справы заваёвы Кастрычніка ў нашай рэспубліцы. Аглядаючыся на пройдзены шлях, нельга ня ўспомніць таго жудаснага становішча, у якім знаходзілася рабочая кляса да рэвалюцыі. Нам, старым рабочым і работніцам фабрыкі, гэта жудаснае становішча асабліва добра вядома. Мы ўсё перажылі на саміх сябе, перанесьлі на сваіх плячох. 12—15-гадзінны рабочы дзень на фабрыцы, дома—холад і голад—вось у кароткіх словах наша мінулае жыцьцё.

А як жыве зараз савецкі рабочы? Цяперашняе яго жыцьцё нават нельга параўнаць з мінулым. Ня будзем хадзіць далёка за фактамі. Возьмем для прыкладу нашу фабрыку. Хто мог думаць і марыць аб тым, што на нашай фабрыцы будзе працаваць больш 2 тыс. рабочых. Хто мог адважыцца думаць аб тым, што ватаршчыца або мотальшчыца дажыве да таго часу, калі будзе працаваць ня больш 7 гадз. і за свой рабочы дзень атрымліваць у шмат разоў больш, чым за 12—15-гадзінны рабочы дзень пры царскім самадзяржаўі.

Аб тым, што мы будзем мець сваю ўласную сталоўку, сваю прыгарадную гаспадарку, жыльлёвыя дамы, клюб, ясьлі, дзіцячы сад, рабфак і ФЗВ—нам ніколі і ня сьнілася.

Запытайцеся любую старую ватаршчыцу, ці мела яна ў старыя часы адпачынак ад сваёй цяжкай нечалавечай працы. Яна вам адкажа, што нават у часе сваёй цяжарнасьці, да самых апошніх дзён, прымушана была гнуць сваю сьпіну, стоячы ля банка-брошу або ватарнай машыны. За некалькі дзён адпачынку перад родамі яна атрымлівала літаральна капейкі ў відзе «дапамогі». Адкуль гэта „дапамога“ бралася, мы таксама добра ведаем. Хлусьня, што гэтую мізэрную дапамогу нам даваў гаспадар або дзяржава Гэтыя капейкі—нашы кроўныя грошы. Іх забіраў у нас гаспадар у выглядзе розных узаконеных і неўзаконеных штрафаў.

Закон аб двухмесячным адпачынку перад родамі і пасьля родаў ўстанавіла толькі савецкая ўлада, і гэтым законам мы карыстаемся, атрымліваючы поўны сярэдні заработак. Але гэта яшчэ ня ўсё. Кожны рабочы, кожная работніца атрымліваюць бясплатнае лячэньне для сябе і сваіх дзяцей. Мы штогодна накіроўваем у дамы адпачынку, санаторыі і курорты сотні рабочых і работніц.

З кожным днём умовы нашага жыцьця ўсё больш і больш паляпшаюцца. Партыя і ўрад паляпшэньню культурна-бытавых умоў рабочай клясы аддае асаблівую ўвагу. Ад нас-жа патрабуецца пасьпяховае выкананьне нашых вытворчых плянаў па ўсіх паказальніках. Вось на гэтым мы і хочам сканцэнтраваць увагу пралетарскай грамадзкасьці.

Ці спраўляемся мы з ускладненымі на нас партыяй і ўрадам задачамі? Не, не спраўляемся. У пастанове ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб гэтым вельмі ясна і выразна падкрэслена. Пленум прызнаў работу прамысловасьці вусім нездавальняючай Мала таго, што прамфінплян па выпуску прадукцыі ня выконваецца. Якасьць прадукцыі таксама вельмі нізкая, яна не задавальняе ўзростых запатрабаваньняў працоўных. Нізкая яшчэ і прадукцыйнасьць працы, а адгэтуль высокі сабекошт.

Усе гэтыя недахопы ў той ці іншай ступені ёсьць на кожным прадпрыемстве. Наша фабрыка, якая займае перадавое месца ў сыстэме Наркамлёгпраму, таксама доўгі час знаходзілася ў глыбокім прарыве. За першае паўгодзьдзе мы недадалі краіне 38 тон прадзіва.

Праўда, пасьля ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК, прыняўшы рад канкрэтных мер, мы значна падцягнуліся. Крывая выкананьня прамфінпляну па нашай фабрыцы за апошні час узьнялася вышэй 100 проц. і ўсё ж пастаўленых пленумам перад намі задач мы ня выканалі. Машыны ў нас загружаны толькі на 98 проц. Прадукцыйнасьць працы кожнага рабочага ў сярэднім складае 97 проц. Зьніжэньне сабекошту плянам прадугледжана на 7,5 проц., мы-ж панізілі толькі на 5,5 проц. Процант угару таксама павялічан супроць пляну на 3 проц. Не, мы пастанову пленуму рэалізуем яшчэ вельмі і вельмі марудна.

Ці рэальны наш плян? Ці ёсьць магчымасьць выканаць ня толькі колькасныя, але і якасныя паказальнікі? Так, для гэтага ў нас ёсьць усе магчымасьці. Лепшы доказ гэтаму—работа нашых лепшых ўдарнікаў, сапраўдных барацьбітоў за тэмпы і якасьць. Ударніца мотальнага цэху тав. Ідэль Лесакадзія, напрыклад, сыстэматычна выконвае сваё вытворчае заданьне на 112 проц. Ударніца таго-ж цэху тав. Марчанка Марыля—на 110 проц., герой першай пяцігодкі, работніца ватэрнага цэху тав. Бараноўская А.—на 110—115 проц., Казлоўская А.—на 125 проц., работніцы ударніцы падрыхтоўчага цэху Цімошчанка Ганна і Шатрова—на 104—109 проц. Усе гэтыя ўдарнікі канчаткова ліквідавалі брак, ня маюць ні аднаго прагула і спазьненьня. На вялікі жаль, мы павінны канстатаваць, што умовы работы лепшых яшчэ ня сталі здабыткам усіх рабочых нашай фабрыкі.

Зараз, уступіўшы ў апошні месяц трэцяга кварталу, мы, работнікі, рабочыя, ІТР фабрыкі бярэм на сябе абавязак, не аслабляючы барацьбы за выкананьне колькасных паказальнікаў, дабіцца поўнага выкананьня якасных паказальнікаў, рашуча палепшыць якасьць выпускаемай намі прадукцыі.

Мы просім ЦО КП(б)Б „Зьвязду“ арганізаваць на сваіх старонках перадкастрычніцкую ўсебеларускую вытворчую пераклічку фабрык, заводаў, цэхаў, брыгад, асобных рабочых, работніц, ІТР, ударнікаў-рабкораў, шматтыражак на лепшую рэалізацыю пастановы ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК в тым, каб XVI гадавіну Кастрычніка сустрэць новым, яшчэ большым уздымам вытворчага энтузіязму рабочай клясы, каб нашу прамысловасьць вывесьці на перадавыя пазыцыі, дабіцца поўнага завяршэньня пляну першага году другой пяцігодкі як па колькасных, так і якасных паказальніках.

Асноўнай задачай пераклічкі па нашай думцы, павінна быць: шырокі абмен вопытам узорнай работы, лепшымі прыкладамі рэалізацыі пастановы пленуму на прадпрыемствах, а таксама выкрыцьцё канкрэтных сабатажнікаў рэалізацыі пастановы пленуму. Мы абавязваемся ў часе пераклічкі, на старонках «Зьвязды» і фабрычнай шматтыражкі шырока асьвятляць работу нашай фабрыкі, яе паасобных зьвеньняў, паказваць вопыт лепшых барацьбітоў за прамфінплян, выкрываць недахопы, канкрэтных бракаробаў.

Мы заклікаем усіх рабочых, работніц, ІТР прамысловасьці БССР уключыцца ў пераклічку і разгарнуць вакол яе шырокую масавую работу.

Баявым лёзунгам пераклічкі павінна быць—ні аднаго прадпрыемства, цэху, брыгады, асобнага рабочага, работніцы, ня выканаўшы свайго гадавога вытворчага пляну да XVI гадавіны Кастрычніка.

За дружную і напорыстую работу, таварышы! Вышэй узьнімем сьцяг ленінскага сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва!

Няхай жыве ленінская камуністычная партыя бальшавікоў і яе ЦК на чале з т. Сталіным!

Няхай жыве КП(б)Б і яе ЦК на чале з лепшым бальшавіком т. Гікалo!

Няхай жывуць ударнікі вытворчасьці—энтузіясты сацыялістычнага будаўніцтва!

Па даручэньні рабочых і работніц ільнапрадзільнай фабрыкі «Дзьвіна»:

Тт. ХОБЕЦ, НІКАЛАЕНКА, ГУЗАВА, МАЖЭЙКА, ЦІМАФЕЕНКА, КАЗАКОВА, СЬВІКЛЯ, СТАРЫКАВА, ФІЛІПАВА, АВЕРЫНА, ПАПАЛА, УГРУКАЎ, ШОЛКАВА, РАГОЖЫНКІ СЬЦЯПАНАЎ, САПЛІНСКАЯ, МАНУЙКА, БАЗЫЛЁВА, ПОСТНІКАЎ, КАЛДОБСКІ, МАРТЫНАВА, ЛАШКЕВІЧ, МАТВЕЕЎ, БАСТАНАВА, ПЯТРОВА, ЛЕБЕДЗЕВА, РАМАНАВА, ПЯТРОЎ, БАГАРОВЫ, БАРАНОЎСКАЯ ЯРМАШКЕВІЧ, ГРЫГОРЕВА, ДЗЯГЕЛЯЎ, БЯЛОЎ, МІНЧЫКАВА, АЛЯКСЕЕВА, БУЖЫНСКАЯ, ШЧАГЛОЎ, ШАГАВА.

ЧЫСТКА І ПРАВЕРКА РАДОЎ ПАРТЫІ.

НЕАДКЛАДНАЯ ЗАДАЧА ЯЧЭЕК, ДЗЕ СКОНЧЫЛАСЯ ЧЫСТКА, ПОУНАСЬЦЮ РЭАЛІЗАВАЦЬ ПРАПАНОВЫ ПРАВЕРКОМАУ.

„Важнейшай задачай партыйных арганізацый зьяўляецца такое замацаваньне рэзультатаў чысткі як у кожнай асобнай ячэйцы, так і партыйнай арганізацыі ў цэлым, якое забясьпечыла-б карэнную перабудову ўсёй партыйнай работы ў бок разгортваньня сапраўды арганізатарскай і глыбокай палітычнай масавай работы, рашучага адмаўленьня ад практыкі голага адміністраваньня і ахопу палітычным уплывам і бальшавіцкім узьдзеяньнем кожнага рабочага і калгасьніка, а таксама ўмацаваньне нізавога і сярэдняга зьвяна на прадпрыемстве, у саўгасе, калгасе". (*З пастановы ліпеньскага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б.*

АБ ХОДЗЕ ЧЫСТКІ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ.

Пастанова бюро Віцебскага гаркома КП(б)Б.

Заслухаўшы паведамленьне гаркамісіі аб ходзе чысткі Віцебскай партарганізацыі, бюро ГК КП(б)Б адзначае, што праводзімая чыстка партыі, як выраз бальшавіцкай самакрытыкі нашай партыі, рашуча ўскрывае недахопы работы Віцебскай партарганізацыі і асобных камуністаў, ачышчаючы Віцебскую партарганізацыю ад клясава-чуждых элемэнтаў, двурушнікаў, парушальнікаў жалезнай партыйнай і савецкай дысцыпліны, перараджэнцаў, кар'ерыстаў, бюракратаў, маральна разлажыўшыхся і шавіністаў розных колераў, значна ўмацоўвае Віцебскую партарганізацыю, падвышае пачуцьцё адказнасьці кожнага камуніста за работу ўсёй партыі, наносіць руйнуючы ўдар па элемэнтах дробнабуржуазнай расхлябанасьці, недысцыплінаванасьці і разболтанасьці, меўшых месца ў Віцебскай партарганізацыі.

Правядзеньне гарадзкой камісіяй чысткі Віцебскай партарганізацыі пад лёзунгам ня толькі ачышчэньня радоў партыі ад недастойных быць у ёй элемэнтаў, але і няўхільнага выкананьня першачарговых бягучых гаспадарчых задач, сапраўды паказала, што чыстка партыі ёсьць магутны сродак лепшага выкананьня гэтых задач і вялічэзнага размаху сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, што забясьпечыла на аснове рашэньняў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб Віцебскай партарганізацыі, шляхам мабілізацыі палітычнай актыўнасьці шырокіх партыйных і рабочых мас, пэўны пералом у бок ліквідацыі прарываў і адставаньня Віцебскай партарганізацыі па выкананьні чарговых гаспадарчых задач.

Бюро гаркома ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Галоўная задача парткалектываў і ячэек ёсьць далейшая мабілізацыя актыўнасьці мас на выкананьне рашэньняў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб прамысловасьці і сельскай гаспадарцы, вядучы рашучую барацьбу з апартуністамі, падвяргаючымі сумненьню рэальнасьць прамфінпляну, тэрміны і якасьць уборкі ўраджаю і выкананьня абавязацельстваў перад дзяржавай, з бальшавіцкай непрымірымасьцю адносячыся да расхлябанасьці, канкрэтных носьбітаў самацёку і самазаспакоенасьці, нядольных узначаліць растучую вытворчую і палітычную актыўнасьць мас.

2. Парткалектывам і ячэйкам, у якіх прайшла чыстка партыі, неадкладна прапрацаваць на бюро і партсходах вывады і прапановы камісіі па чыстцы, намеціўшы канкрэтныя мерапрыемствы іх правядзеньня ў жыцьцё, усклаўшы пэрсанальную адказнасьць асоб за тэрміны правядзеньня, устанавіўшы абавязковы парадак праверкі даручэньняў і пастаноў на бюро.

3. У сувязі з тым, што чыстка ўскрыла неправільны расстаноўку партсіл на рашаючых вытворчых участках работы (прадпрыемства, калгас) бюро ГК прапануе расстаноўку партсіл правесьці з такім разьлікам, каб асноўная маса камуністаў знаходзілася непасрэдна на вытворчасьці (прамысловасьць і сельская гаспадарка) і там забясьпечыць партыйнае кіраўніцтва і ўвагу. Умацаваць нізавыя і сярэднія партзьвеньні моцнымі, палітычна падрыхтаванымі камуністамі, рашуча высоўваючы кіруючых работнікаў з ліку актыву, выяўленага ў працэсе чысткі, зрабіўшы партгрупы і цэхавыя ячэйкі сапраўднымі арганізатарамі і кіраўнікамі партыйнага, грамадзкага і гаспадарчага жыцьця на канкрэтных вучастках вытворчасьці.

4. У мэтах павышэньня авангардной ролі і адказнасьці кожнага камуніста за выкананьне партдаручэньняў і абавязацельстваў, увесьці ў сыстэму партработы заслухоўваньне індывідуальных справаздач членаў і кандыдатаў партыі на партгрупах, бюро і партсходах аб іх вытворчай і грамадзка-палітычнай рабоце.

5. На аснове матар'ялаў чысткі Віцебскай партарганізацыі аб значнай колькасьці палітычна няпісьменных членаў і кандыдатаў партыі, што сьведчыць аб дрэнной пастаноўцы партвучобы. Бюро ГК прапануе рашуча перабудаваць мэтады і сыстэму партыйнай асьветы і тэхнічнай вучобы, увязаўшы праграму ўсіх зьвеньняў партасьветы з вывучэньнем тэхнікі варштатаў і машын з тым, каб ні адзін камуніст не застаўся па за палітычнай вучобы і ў абавязковым парадку асвоіў мінімум тэхнічных ведаў. Выключную ўвагу зьвярнуць справе выхаваньня і палітычнай вучобы кандыдатаў партыі і спачуваючых.

6. Даручыць арганізацыі ў пяцідзённы тэрмін праверыць становішча работы арганпартгруп, наміраваных ГК на прадпрыемствы, забясьпечыўшы стваральне і пасылку новых груп на ўсіх прадпрыемствах, дзе праходзіць або прадстаіць чыстка парткалектываў і ячэек.

7. Абавязаць парткалектывы і ячэйкі на бліжэйшым бюро абгаварыць пытаньне аб становішчы з уплатай членскіх узносаў камуністамі ў ячэйках, заслухаўшы сакратароў цэхячэек і зборшчыкаў аб іх рабоце па зборы членскіх узносаў і асобных камуністаў, маючых і ашчэ не пагасіўшых сваю запазычанасьць, і надалей увесьці, як сыстэму, штомесячную праверку ходу паступленьня ўзносаў і выкананьня вынасімых рашэньняў.

8. Бюро ГК ашчэ раз указвае сакратарам парткалектываў і ячэек аб прыняцьці рашучых мер да ўпарадкаваньня вучоту камуністаў у ячэйках і парткалектывах; шляхам вылучэньня асобных таварышоў са складу бюро, адказных за становішча вучоту ў партарганізацыі.

Сакратар ГК КП(б)Б
ЖУРАЎЛЁЎ.

Зьнішчыць недахопы, выяўленыя ў час чысткі, рашуча ўзьняць авангардную ролю камуніста на вытворчасьці.

Спачатку некалькі лічб. Прамфінплян за дзьве дэкады жвіўня выкананы на 54 проц. Перавозка груза-тон недавыканана на 46 проц. За адно толькі паўгодзьдзе здарылася 7 аварый і паломак машын. Прастой машын тут частае зьявішча. У ліпені з 19 маючыхся у наліччы машын, работала толькі 4, астатнія машыны з-за нядбайных адносін і дрэннай якасьці рамонту былі выведзены са строю.

Усё гэта было выяўлена пры чыстцы ячэйкі Саюзтрансу. Мімаволі паўстае пытаньне: а як-жа ячэйка рэагавала на гэткае, з рук вон дрэннае, становішча Саюзтранса?

Амаль на кожным пасяджэньні бюро ячэйкі заслухоўвала інфармацыю гаспадарнікаў, вынасіла рэзалюцыі. Але-ж гэтыя пастановы заставаліся ляжаць над спудам у сэкратара ячэйкі т. БАХРАХА.

Сярод камуністаў ячэйкі Саюзтранса адсутнічае жалезная партыйная і працоўная дысцыпліна. Асобныя камуністы не паказваюць прыкладаў барацьбы за плян. Наадварот, паасобныя члены партыі, як напрыклад ПЫЛЬСКІ зрабіў тыдневы прагул бяз уважлівых прычын, і яго пакінулі на рабоце. Аб гэтым добра ведаў БАХРАХ, але сьвядома замазаў гэтае пытаньне. Бюро ячэйкі не прыцягнула прагульшчыка Пыльскага да адказнасьці. Гэта гаворыць аб тым, што ў ячэйкі Саюзтранса ёсьць элемэнты сямейнасьці, дробнабуржуазнай расхлябанасьці.

Трэба зьвярнуць сур'ёзную ўвагу на маючы месца грубы заціск самакрытыкі сярод рабочых, нават сярод камуністаў. Былі выпадкі, калі рабочы, жадаючы напісаць у кнігу скарг, пры сталоўцы свае заўвагі, атрымліваў ад загадчыка сталоўкі т. СЕРАДА іранічны адказ: „Кнігі няма, прыдзіце заўтра". Гэтыя абураючыя факты праходзілі міма ўвагі бюро ячэйкі.

Чыстка ячэйкі выявіла, што рад камуністаў не займаюць авангардной ролі на вытворчасьці. Наадварот, яны цягнуцца ў хвасьце беспартыйнай масы па выкананьню прамфінпляна. Вось факты.

БЕГУНОЎ, член партыі працуючы рамонтным сьлесарам, ён шмат разоў дапусьціў паўторнасьць рамонта машын з за нізкай якасьці яго работы, некаторыя машыны былі выведзены са строю. Некалькі дзён таму назад Бегунову далі новы палец паваротнай цапфы. Замест таго, каб акуратна, добраякасна падагнаць палец да цапфы, Бегуноў ударыў па ім малаткам і зламаў яго. Таксама за ім некалькі разоў прыкмечалася неправільная зборка каробкі скорасьцей.

БАГДАНАЎ—былы сакратар ячэйкі Рудніцкага сельсавета. Будучы сакратаром, Багданаў зросься з кулацкімі элемэнтамі, патураў кулацкаму сабатажу загатовак і вясеньняй сяўбы. Бюро гаркома за гэта зьняла Багданава з працы сакратара ячэйкі.

ФЁДАРАЎ—вадзіцель машыны № 13 З за яго нядбайнасьці былі выпадкі сур'ёзнага папсаваньня машыны, з прычыны чаго машына доўгі час стаяла ў рамонце. Фёдараў ня сочыць за захаванасьцю разіны, езьдзіць на спушчаных пакрышках. За парушэньне трудысцыпліны Фёдараў два разы сядзеў пад арыштам па адміністрацыйнай лініі.

Нельга сказаць, што гэтыя асобы характэрны для ўсёй ячэйкі. Чыстка таксама выявіла сапраўдных бальшавікоў, змагаючыхся за рэальны бальшавіцкі плян, паказваючых узоры работы на вытворчасьці.

ТРУХАНОВІЧ—член партыі, вадзіцель машыны. За час сваёй работы ў Саюзтрансе ня меў ніводнай аварыі. Сыстэматычна перавыконвае плян. Машына, на якой працуе Трухановіч, перавыконвала плян прабега на 30 тысяч кілёмэтраў, за што ён атрымаў прэмію ў 300 руб. На вытворчасьці Трухановіч зьяўляецца ўзорам для другіх партыйцаў і беспартыйных рабочых. Ён сам удзельнічае ў рамонце сваёй машыны, сочыць за сваёй машынай, каб яна была ў поўнай спраўнасьці. Акрамя таго, Трухановіч зьяўляецца добрым агітатарам масавіком, які штодзённа праводзіць масава-растлумачальную работу сярод рабочых.

ЗАЙЦАЎ—член партыі, першаклясны шофэр, ударнік на рабоце. Удзельнік Усесаюзнага конкурса на лепшую язду, дзе атрымаў трэцяю прэмію СНК СССР—грамату лепшага шофэра і грашыма 300 руб. Зайцаў у сваёй рабоце не дапусьціў ніводнай аварыі машыны. Яго машына № 14 па ўсім паказчыкам заўсёды ідзе ўперадзе астатніх машын.

Трухановіч і Зайцаў свой багаты вопыт па аўладаньні тэхнікай язды перадаюць астатнім рабочым. Пад іх кіраўніцтвам камсамолец Стаякоў стаў лепшым шофэрам-вадзіцелем, неаднаразова прэміяваны за ўдарную работу.

Чыстка ячэйкі Саюзтранса павінна аслабаніць партыйныя рады ад усіх прымазаўшыхся і чуждых партыі элемэнтаў. Яна бязумоўна ўмацуе работу ячэйкі, узьніме авангардную роль камуніста на вытворчасьці з такім разьлікам, каб Віцебскае аддзяленьне Саюзтранса стала перадавым на Беларусі.

БАС, ШАЛЫТ.

ПАРТКАЛЕКТЫЎ ФАНЭРНАГА ЗАВОДУ АБ ПАЛІТВЫХАВАНЬНІ ПЕРАВЕДЗЕНЫХ У СПАЧУВАЮЧЫЯ ЗАПАМЯТАЎ.

Пастановай камісіі па чыстцы мяне за палітычную няпісьменнасьць перавялі з кандыдатаў у спачуваючыя. З гэтага часу прайшло больш як два месяцы. У мяне вялікае жаданьне падняць свой палітычны ўзровень з тым, каб праз год, а то і менш зноў уступіць у кандыдаты партыі. На жаль калектыў мне ў гэтым амаль нічым не дапамагае. Праўда з першых дзён пасьля чысткі, аб нас пераведзеных у спачуваючыя, к р ы х у клапаціўся а потым, парткалектыў праз некаторы час, зусім за[illegible]у. Напрыклад, мяне настолькі загрузілі работай на прадпрыемстве, што няма ніякай магчымасьці наведваць палітгурток. Дый аб днях заняткаў нас зусім не абвяшчаюць.

За ўвесь час пасьля майго пераводу ў спачуваючыя, са мной ні аднаго разу не гаварыў сакратар калектыву. Пытаўся я з ім некалькі разоў пагутарыць аб маёй рабоце, але нашага сэкратара ніяк не злавіць на заводзе, бегае, і ў рэзультаце нагрузку, якую мне дала ячэйка (прафорг) я выконваю слаба, бо дрэнна знаём з гэтай работай, а параіцца няма з кім.

Трэба сказаць, што таварышы, пераведзеныя ў спачуваючыя, зусім адбіліся ад партыйнага жыцьця. І гэта таму, што аб нас парткалектыў запамятаў.

Прашу бюро калектыву аказаць нам дапамогу ў падняцьці майго палітычнага ўзроўня. Для гэтага трэба стварыць умовы для нармальнай вучобы.

Рабочы фан. заводу ПАХОМЕНКА.

АД РЭДАКЦЫІ.

Ліст тав. Пахоменка сьведчыць аб тым, што бюро парткалектыву фанэрнага заводу ігнаруе работу з кандыдатамі і спачуваючымі. А гэта зьяўляецца вынікам таго, што бюро парткалектыву не зразумела палітычнага значэньня пастановы ЦК УсеКП(б) аб чыстцы, дзе гаворыцца, што перавод у кандыдаты і спачуваючыя правядзіцца «у мэтах палітычнага выхаваньня і лепшай падрыхтоўкі палітычна непадрыхтаваных таварышоў з тым, каб праз год зноў паставіць пытаньне аб іх пераводзе ў члены партыі, калі яны змогуць за гэты год паказаць сваю палітычную пісьменнасьць, неабходную для членаў партыі».

Нават пасьля пастановы гаркому партыі аб рабоце сярод кандыдатаў і спачуваючых, у якой катэгарычна патрабавалася „НЕАДКЛАДНА РАЗГАРНУЦЬ ПАЛІТЫЧНА-ВЫХАВАЎЧУЮ РАБОТУ СЯРОД КАНДЫДАТАЎ І СПАЧУВАЮЧЫХ ЗЬВЯРНУЎШЫ АСАБЛІВУЮ ЎВАГУ НА АРГАНІЗАЦЫЮ СПАЧУВАЮЧЫХ ВАКОЛ ПАРТКАЛЕКТЫВАЎ І ЯЧЭЕК. НА ІХ ВЫХАВАНЬНЕ Ў ДУХУ БАЛЬШАВІЦКАЙ дысцыплінаванасьці, у духу непрымірымай барацьбы за генэральную лінію партыі", бюро парткалектыву працягвае недаацэньваць работу з кандыдатамі і спачуваючымі, зрываючы гэтым самым пастанову бюро гаркому.

За зрыў работы з кандыдатамі і спачуваючымі, за ігнараваньне пастановы бюро гаркома, бюро парткалектыву фанэрнага заводу павінна несьці суровую адказнасьць.

Работа са спачуваючымі і кандыдатамі на фанэрным заводзе павінна быць неадкладна налад жана.

УДАРНІКІ АЛЕЙНАГА ЗАВОДА ДАТЭРМІНОВА СКОНЧЫЛІ РАМОНТ.

Гарадзкому камітэту КП(б)Б, гарсавету, гарпрафсавету, рэдакцыі „Віцебскага пралетара".

Вызначаны бюро гарадзкога камітэту партыі тэрмін рамонту алейнага завода адзін месяц, замест вызначанага плянам трэста тэрміну ў паўтара месяца, ударнікамі рабочымі алейнага завода, пад непасрэдным кіраўніцтвам бюро гарадзкога камітэту партыі, шляхам разгортваньня спаборніцтва і ўдарніцтва закончан за 29 дзён.

З такімі ж неаслабнымі тэмпамі з сёнешняга дню ўдарнікі маслабойцы прыступілі да выкананьня прамфінпляну па ўсіх паказальніках.

Дырэктар завода ГУРЭВІЧ.
Сэкратар парт'ячэйкі ШАПІРО.
Старшыня заўкома УС.

Чыстку партарганізацыі алейны завод сустрэў датэрміновым сканчэньнем рамонту.

Віцебскі АЛЕЙНЫ ЗАВОД зьяўляецца дзіцянём першай пяцігодкі—адзін з „518". Завод мае замежнае абсталяваньне. Элеватар з двумя сілосамі, ёмкасьцю у 5000 тон. Пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі, рабочыя і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал прарабілі вялікую працу па асваеньні заводу.

Вузкае месца ва аўладаньні заводу зьяўляецца Андрэсонаўскі цэх, які павінен абжываць алея ў жмых. З-за адсутнічаньня двух вальцаў, аўладаньне цэху ідзе вельмі марудна.

Партыйная ячэйка заводу налічвае ў сваіх радох 11 членаў партыі і 13 кандыдатаў. Ячэйка ў барацьбе за выкананьне прамфінпляну дабілася таго, што плян за сем месяцаў выканан па—жмыху—104, экспарт—100,36, аліфа—112.

Па якасьці завод вышаў другім ў Саведкім саюзе сярод алейных заводаў і замест 7 процантаў нармальнай астачы алею у жмыхі, завод дабіўся 6,96 проц.

Брыгада, на чале якой стаіць член партыі т. БУШУЕЎ ідзе ўперадзе ўсіх па якасьці на заводзе. Дабіўся гэта ён толькі таму, што паклаў у аснову сваёй штодзённай працы пастанову студзеньскага пленуму ЦК УсеКП(б). Ён кожны дзень пасьля працы праводзіў сход брыгады па падагульваньні работы за дзень і вызначэньні задач на заўтра.

Камуністы БУШУЕЎ, ЛІСОЎСКІ і КУПЕР—гэта ганаровасьць алейнага заводу. Яны гэта даказалі на рамонце заводу. Калі рамонт павінен быў быць зроблены па пляне за паўтара месяцы, парт'ячэйка разгарнуўшы мэтады сацспаборніцтва і ўдарніцтва, дабілася правядзеньня рамонту за 29 дзён. Брыгада Лісоўскага скончыла рамонт электраабсталяваньня заводу на 5 дзён раней.

Маюцца на заводзе партыйцы, як-та: КРАСЬЦІН, які добраахвотна паехаў на заклік гаркому партыі на сталую працу ў калгас.

Але ж маюцца і такія партыйцы, якія не зацікаўлены ў працы заводу, рабілі прагулы, тым самым падрывалі прадпрыемствы на заводзе, да такіх адносіцца КАВАНОЎСКІ. І правільна зрабіла ячэйка, калі прыцягнула да партадказнасьці. Партыец ЛОБМАН-ДЗІЕЎСКІ сымулюе і п'янствуе. 1-га верасьня зрабіў прагул, а ячэйка па ім не ўдарыла, не мабілізавала вакол гэтага факту парт'ячэйкі.

Значным недахопам зьяўляецца тое, што калі завод быў у рамонце, палітгурток не працаваў. Партыйная ячэйка мала займалася з моладзямі членамі партыі, нават да рамонту. Гэта адбіла з адмоўных бакоў працы ячэйкі.

Не заўсёды, калі бываюць сходы, у партыйцы аб гэтым ведаюць. Прыкладна, 1 верасьня калі праводзіўся сход парт'ячэйкі па пытаньні падрыхтоўкі да чысткі партыі, ня ўсе ведалі парадак дню.

На сходах маецца добрая актыўнасьць. Заўсёды прысутнічаюць і беспартыйныя рабочыя.

Прынятыя пастановы канкрэтныя, гэта дае магчымасьць свачасова правяраць іх. Партыйныя нагрузкі маюць усе камуністы, але як кажа сакратар тав. ШАПІРА «слаба правяраюцца». Пастанова ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б) аб становішчы работы віцебскай парт. арганізацыі была свачасова прапрацавана. Ячэйкай былі вызначаны канкрэтныя мерапрыемствы па рамонту заводу, які датэрмінова быў закончан. З маючыхся на заводзе 24 партыйцаў 5 знаходзіцца на вёсцы. Да чысткі праведзены гутаркі па брыгадам. 1-га верасьня адбыўся агульна-партыйны сход, прысьвечаны пытаньням чысткі. Чыстку партыі завод сустрэў датэрмінова і добраякасным рамонтам заводу.

БЯГУНОЎ, ЦІМКІН, КЛУП.

Л. ГЕРЦОВІЧ.

ЗА БАЛЬШАВІЦКУЮ ПЕРАБУДОВУ І УЗМАЦНЕНЬНЕ КЛЯСАВАЙ БАЯЗДОЛЬНАСЬЦІ ЛКСМБ*)

У пачатку 1932 г. ЦК УсеЛКСМ з усёй бальшавіцкай выразнасьцю паставіў перад абноўленым кіраўніцтвам ЛКСМБ задачу—ліквідаваць групаўшчыну, склоку, сямейнасьць, месьніцтва ў арганізацыі і кіраўніцтве, мабілізаваць ЛКСМБ на барацьбу за правільнае правядзеньне лініі партыі.

Прайшло паўтары гады. Гэтымі дзнямі ЦК УсеЛКСМ заслухаў даклад ЦК ЛКСМБ. У адным з цэнтральных пунктаў свайго рашэньня ЦК запісаў: «ЦК ЛКСМБ пасьля абнаўленьня кіраўніцтва ліквідаваў групаўшчыну, склоку і месьніцтва у камсамольскай арганізацыі, дабіўся згуртаваньня арганізацыі вакол правільнай палітычнай лініі партыі».

І на самой справе, за гэты прайшоўшы час, арганізацыя і кіраўніцтва дабіліся цэлага раду буйнейшых дасягненьняў у згуртаваньні камсамольскай арганізацыі вакол лініі партыі.

Няма патрэбы тут падрабязна перачічаць усе факты нашых посьпехаў. Правільна будзе, калі мы сканцэнтрэм увагу актыву на нашых недахопах і памылках, на слабых баках работы ЦК і арганізацый, па-бальшавіцку маблізуемся на перамаганьне іх, на ўзьняцьцё на магчыма высокую ступень якасьць кіраўніцтва і дзейнасьці ўсяго ЛКСМБ.

Чыстка радоў нашай партыі выявіла цэлы рад недахопаў у рабоце камсамольскіх арганізацый. Было б, таварышы, няправільным, калі б некаторыя камсамольцы разважалі такім чынам: «Вось праходзіць чыстка партыі, мы, камсамольцы, яе наведваем і дапамагаем, чым можам, а нагул гэта справа толькі партыі».

Чыстка нашай партыі паставіла з усёй востраcьцю пытаньне аб тым, што ў паасобных зьвеньнях нашых арганізацый і кіраўніцтва мае месца прытупленьне клясавай пільнасьці. Некаторыя нашы кіраўнікі ня ўлічылі тых абставін, у якіх мы знаходзімся, не зразумелі тых працэсаў, якія зараз адбываюцца. Яны думалі, што клясавы вораг, шкоднік—гэта таўстун, якога звычайна малявалі на плякатах, у кніжках. Яны не зразумелі таго, што клясавы вораг «ціхай сапай» пралазіць да нас і імкнецца заваяваць паасобныя зьвеньні і ў гэтых зьвеньнях праз сваіх прадстаўнікоў разлагаць нашы рады.

Вось, напрыклад, Хаймоўскі з завода «Камунар»—сын буйнага гандляра. Ён некал кі год «кіруе» камсамольскай арганізацыяй, арганізоўвае вакол сябе камсамольцаў заводу, нарэшце, дабіваецца таго, што ўлазіць у давер'е гаркому КСМ. І толькі пасьля доўгага часу ўдалося выкрыць гэтага клясавага ворага і выключыць з камсамолу.

У нас не адзін толькі Хаймоўскі. За апошнія месяцы з менскай арганізацыі выключаны сотні чужакоў. Мы за час веснавой сяўбы выключылі з радоў ЛКСМБ больш 6 000 камсамольцаў Каля 2.000 камсамольцаў прыходзіцца за лік чужакоў.

Я-бы мог пералічыць шмат фактаў і прозьвішчаў, мог бы цэлымі гадзінамі аб іх гаварыць, але не аб гэтым сёньня ідзе гутарка. Гутарка ідзе аб нас, аб актыве, аб кіраўнікох. Я хачу сказаць, што мы ў Беларусі выключылі з радоў КСМ чужы элемэнт, не змаглі гэтыя факты выкарыстаць у належнай меры для таго, каб на гэтых фактах мабілізаваць усю камсамольскую арганізацыю. Няўжо было ня досыць гэтых 20 30 чалавек, якія ў менскай арганізацыі выключаны, каб на аснове гэтых фактаў кожнай камсамольскай ячэйцы, кожнаму камсамольцу растлумачыць, мабілізаваць іх увагу, павысіць іх клясавую пільнасьць?

Але мы гагага не зрабілі і вялікая памылка як Цэнтральнага Камітэту, так і мясцовых арганізацый у тым, што мы на мясцох ня ўсюды і незаўсёды сваячасова мабілізоўвалі камсамольскую арганізацыю на вынясеньне ўроку з гэтага і на разгортваньне рашучай барацьбы за самаачышчэньне ад чужых элемэнтаў. Тут я павінен з усёй рашучасьцю падкрэсьліць, што дзе ні дзе ў арганізацыі, асабліва ў частцы кіруючага актыву пранікаюць настроі сямейных абываталькіх адносін да працыцыковых партыйных пытаньняў. Бо чым жа як не антыпартыйным вы падам можна назваць такія разважаньні, якія панавалі ў ранейшым кіраўніцтве, якія ашчэ самі засталіся і зараз што „мы працуем у асаблівых умовах і нам усё ні па чым". Такія антыпартыйныя настроі, якія часам пры крываюцца псэўда-нацыянальнымі асаблівасьцямі БССР, мы павінны разграміць, бо яны нічога агульнага ня маюць з лініяй нашай партыі, з лініяй саюзу.

Т. Косараў у якасьці абвінавачаньня менскаму кіраўніцтву і ЦК ЛКСМБ сказаў, што мы не стварылі ў кожнага камсамольца настрою непрымірымай барацьбы за чыстату сваіх радоў, не стварылі абстаноўкі, каб кожны камсамолец у паасобку думаў: „Хто ў мяне ў арганізацыі, з кім я ў арганізацыі працую"?

Клясавы вораг павінен атрымаць ад нас рашучы ўдар, на барацьбу з ім трэба мабілізаваць ўсіх камсамольцаў, —у гэтым зарука ўмацаваньня арганізацыі і пераматаньня памылак, якія мы дапусьцілі.

Бязумоўна, Менскі гарадзкі камітэт змагаўся з чужаком. Але як змагаўся? Ён выносіў рашэньні, пісаў вялікія рэзалюцыі. Але нельга-ж толькі пісаць рэзалюцыі. Задача заключаецца ў тым, каб дэтальна прагледзець рады камсамольцаў, ачысьціць іх ад варожых элемэнтаў, умацаваць камсамольскую арганізацыю.

Праблему кіраўніцтва мы ашчэ не паставілі на належную вышыню. Мы на гэтым вучастку ашчэ адстаем, за што нас моцна трэба біць.

Проста скажу, што ЦК УсеЛКСМ вельмі моцна раскрытыкаваў практыку работы беларускай арганізацыі і ЦК у пытаньні кіраўніцтва і падбору кадраў.

У пытаньні падбору і расстаноўкі нашых кадраў мы дапусьцілі самацёк. Вылучэньне сапраўдных, праверaных камсамольскіх кадраў у нас ішло дрэнна. Напрыклад у Менску няма аргад дзелу. Менскі ГК узьнімае шум перад ЦК: дайце арганізацыйшчыка. Часіншоў, працаваць трэба. ЦК—яго арганізацыі і сэкратарыят—часам так і падыходзілі: вось чалавек пахыходзячы і па форме і па «трапалёгіі»—бралі і пасылалі. Папрацаваў, скажам, Іваноў 3 месяцы, аказаўся „шляпай"—зьнімаем і пасылаем сэкратаром калгаснай ячэйкі—на пакараньне.

Ці вось ашчэ: няма сэкратара РК. Падвярнуўся скажам, нейкі камсамолец Іваноў, паглядзелі на гэтага Іванова—ніштo сабе, хлопец падыходзячы з вы гляду, ну бяруць і прызначаюць. Так падбіраць саюзныя кадры нельга, ад такой практыкі „вылучэньня" трэба зусім адмовіцца.

Правільная расстаноўка камсамольскіх кадраў, дасканалая ўвага да падбору кожнага чалавека, правільная работа з імі—вырашаюць зараз усё.

Праблема кіраўніцтва—гэта самая вострая праблема для нас. І трэба сказаць, што менскі актыў і некаторыя іншыя зьвеньні нашай арганізацыі ня зусім зразумелі ўсё гэта. Менскі актыў, кіраўніцтва ня ўлічылі ўсіх тых зьяў вішч, якія мелі месца да гэтага часу. І пусьцілі справу кадраў на самацёк. Ня ўлічылі таксама пытаньня аб расстаноўцы сіл і не разгарнулі ў арганізацыях сапраўды бальшавіцкай барацьбы па выкарчаваньні практыкі самацёку.

Мне здаецца, што трэба бяз усякай мітусьні ў Менску, у раёне, ва ўсёй беларускай камсамольскай арганізацыі праверыць усіх групоргаў, сэкратароў ячэек. Трэба ўзяць завод за заводам, калгас за калгасам, раён за раёнам, паглядзець, хто ў нас сядзіць у кіраўніцтве. Трэба стварыць абставіны, каб камсамольскай групай і ячэйкай кіраваў сапраўды праверaны рабочы і калгасьнік, а ўсё барахло, ўсё што прыліпла, усё наносное трэба выгнаць з нашых радоў, з кіруючых органаў. Добры энтузыяст, энэргічны малады, адданы справе партыі рабочы, калгасьнік павінен у нас стаць ля руля кіраўніцтва.

Да гэтага часу да нас у кіраўніцтве маглі ісьці чужакі толькі таму, што ў нас ня было дасканалага вывучэньня кадраў, ня было работы з імі, ведань ня іх.

А чаму не дабіцца такога становішча, каб нам вылучаць новавырастаючыя кадры? Чаму ЦК ня ведае людзей, апрача пяцёркі ў райкоме, якою ён кіруе. А ёсьць сотні камсамольцаў—добры рэзэрв для вылучэньня ў кіраўніцтва. Гэта факт. Праблема вывучэньня, высоўваньня гэтых кадраў—гэта вялікая праблема, гэта клясавая праблема.

Некалькі слоў аб якасьці нашай работы. Мы ў менскай арганізацыі, у кіраўніцтве Беларускай арганізацыі за гэтыя паўтары гады браліся за торф, і за чыгуначны транспарт, і за авіяцыю, і за хэмію, і за электрычнасьць, і за швейную прамысловасьць. Няма ні аднаго пытаньня, каб ЦК, гарком, ці ячэйка ня вырашылі. За ўсё хапаюцца, але не даводзяць да канца.

У практыку беларускага кіраўніцтва ўкаранілася такая ўстаноўка: калі вы, напрыклад, сёньня ня вынесьлі рашэньня па торфу, вы—апартуніст. Калі вы сёньня не напісалі рашэньне па сплаву—апартуніст. Набухае вялікая паперавестка дня і атрымліваецца, што мы за ўсё хапаемся, але толькі за верхавінку, а кораня пытаньня глыбока не бярэм. Таму паляпшэньне якасьці нашай работы, у першую чаргу ЦК ЛКСМБ, заключаецца ў тым, каб не раскідацца, а браць рашаючае зьвяно і д водзіць яго да канца.

Задача кіраўніцтва на месцы, у раёнах, гаркоме, ЦК заключаецца ў тым, каб моцна ўзяцца за рашаючы вучастак работы, узяць гэты вучастак пад свой нагляд і кіраваць ім. Напрыклад возьмем швейную прамысловасьць. Трэба распрацаваць гэта пытаньне такім чынам, каб кожны тавары ыш, які працуе над пытаньнем перабудовы швейнай прамысловасьці, вывучаў працэсы, ведаў справу, накіроўваў, кіраваў, як добры гаспадарнік, ведаючы гэту справу. Скончыў работу з адной—пераключайся на іншую работу і г. д.

Вось некалькі прыкладаў практыкі раскіданасьці: Дрысенскі раён высунуў прапанову аб брыгадах «Д і П» у льнавадзтве. Зашумелі з гэтай справай у мінулым годзе. Выступіла па гэтым пытаньні і «Чырвоная зьмена». Нашумелі і скончылі на гэтым справу.

ЦК узьнімае пытаньне—за культурную хату калгасьніка. Выступілі мы аб гэтым на II-м зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў і зноў не давялі да канца.

Сэкратар ЦК нашай партыі тав. Гікало зьвяртаецца да менскага камсамолу з лістом, дзе апісвае становішча на ПЭЦ і просіць, каб камсамол Менску даў на будаўніцтва 300 чалавек.

Мы пачалі выконваць дырэктыву тав. Гікало, але да сёньняшняга дня выканалі. Тав. Гікало патрабаваў 300 чалавек, а прышло на працу за 2 дэкады на будаўніцтва толькі 200 чалавек і на гэтым супакоіліся. Вось вам практыка работы.

Што і казаць: «Шумім, братцы, шумім». Змагацца трэба з такімі мэтадамі кіраўніцтва.

Нашы маладыя, энэргічныя, таленавітыя бальшавікі, гатовыя жыцьцё аддаць за нашу справу, павінны ў кіраўніцтве заняць належнае месца. У Менскім гаркоме і Цэнтральным Камітэце яны павінны правесьці барацьбу з пратыганшчынай у горшым сэнсе гэтага слова, з балбатунамі.

У нас ёсьць тысячы маладых, энэргічных бальшавікоў, якія могуць працаваць. І тады, калі яны будуць уцягнуты ў работу, камітэты будуць моцнымі кіраваць і павядуць нашу арганізацыю на барацьбу за бальшавіцкія справы.

Нам трэба зараз як ніколі заняцца пытаньнем некаторай затрымкі росту. У мяне ёсьць весткі, што некаторыя арганізацыі (мяне сёньня інфармавалі аб Дзяржынскай арганізацыі і інш.) фарсуюць рост, павялічваюць свае рады і даволі часта па прыкладу фабр к Менску праводзяць вярбоўку у камсамол. На менскіх фабрыках падыходзілі да варштату і падносілі маладому хлопцу камсамольскі білет. Гэта зьяўляецца ў корані няправільным. У некаторых зьвеньнях мы прыпынім рост. Напрыклад, арганізацыі на заводзе Варашылава і раду іншых арганізацый мы не дазволім расьці, бо там ня ўсё ў парадку.

Некаторая затрымка росту, забарона расьці некаторым арганізацыям, рашае самаачышчэньне камсамольскіх радоў ад клясава-варожых, прымазаўшыхся і перараджэнцкіх элемэнтаў—павінна зьвяліцца буйнейшым мерапрыемствам у разгортваньні больш глыбокай сыстэматычнай работы з беспартыйнай моладзьдзю.

Мы маем у калгасах, саўгасах, МТС на прадпрыемствах сотні, тысячы партыйнай моладзі, маладых ударнікаў, якія разумеюць задачы нашага саюзу і партыі і змагаюцца штодня за ажыцьцяўленьне гэтых задач, але штодзённай работы з імі, чулага падыходу, вывучэньня іх настро ў, накіраваньня іх справядлівых патрабаваньняў на правільны шлях—усяго гэтага ашчэ няма, з боку ячэйкі, райкому.

Мы знойдзем зусім пязначную колькасьць ячэек, сакратароў райкому, якія ведаюць, колькі ёсьць беспартыйнай моладзі ў сваім калгасе, саўгасе, заводзе, раё е, хто з гэтай моладзі бліжэй стаіць да нас, з кім трэба больш папрацаваць. Гэтага на вялікі жаль,

НАПЯРЭДАДНІ ЎСЕБЕЛАРУСКАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ ЎДАРНІКАЎ ЯКАСЬЦІ.

Пастанова ЦК КП(б)Б аб рабоце фабрыкі „Прафінтэрн" ня стала яшчэ праграмай дзейнасьці фабрычных арганізацый.

Рашуча перабудаваць работу, пакончыць з бракам і выпускам нядобраякаснай прадукцыі, заваяваць права на удзел ва Усебеларускім зьлёце ударнікаў якасьці—справа гонару кіраўнікоў і усіх ударнікаў фабрыкі.

Брак і пераробкі увайшлі у сыстэму.

З часу, як ЦК КП(б)Б вынес сваю спэцыяльную пастанову аб рабоце фабрыкі «Прафінтэрн», прайшло роўна два месяца і 23 дні—тэрмін больш чым выстарчальны для перабудовы сваёй работы ў напрамку поўнага выкананьня колькасных і якасных паказальнікаў прамфінпляну.

Аднак, далей алілюйскіх абяцаньняў і шматлікіх рэзалюцый фабрычныя арганізацыі не пайшлі. Па-ранейшаму прамфінплян ня выконваецца, якасныя паказальнікі яшчэ нават пагоршыліся.

Лічбы сапраўды награжаючыя. За ліпень і 20 дзён жніўня фабрыка не дадала краіне адзеньня на 117.000 рублёў. Але гэта ня ўсё. У лік выпрацаванай фабрыкай прадукцыі за ліпень і частку чэрвеня ўвайшло 20 167 браканаваных адзінак, што складае да агульна выпрацаванай прадукцыі за гэты час—24 проц. За першую палову жніўня ў рамонце знаходзілася 77 машын.

Асабліва вялікіх награжаючых разьў мераў дасягнулі прагулы і цякучасьць рабочай сілы. Толькі ў адным цэху паліто 21 жніўня ня выйшлі на работу 73 чал. За 26 дзён жніўня на фабрыку прыбыла 139 чалавек і пакінула фабрыку 151. На сёньня цэхі не ўкамплектаваны на 135 чал.

Чаму?

Справай паляпшэньня бытавых умоў рабочых на фабрыцы ніхто не займаецца. Сталовая працуе з рук вон дрэнна, абеды нізкай якасьці. Работа ЗРК. За якіх-небудзь 6 месяцаў гэтага году ЗРК мае ў сваім балянсе 39.000 руб. дэфіцыту. Прыём новых рабочых арганізаван дрэнна. Мелі месца факты нявыдачы прадуктовых картак новапрыбыўшым рабочым на працягу 5—10 дзён.

З асаблівай сілай трэба падкрэсьліць фармальную перабудову парт-праф і гаспадарчых арганізацый. Усе тэхнічныя сілы сканцэнтраваныя ў аддзелах фабрычнага кіраўніцтва. Ні плянавы аддзел, ні АТК, ні ТНБ у цэхі ня спусьціліся, працягваюць „кіраваць" з сваіх габінэтаў.

Усе гэтыя факты з усёй выразнасьцю гавораць аб тым, што кіраўніцтва фабрыкі ня можа забясьпечыць рэалізацыю праграмнай пастановы ЦК КП(б)Б аб рабоце фабрыкі.

Ну, а Белшвэйтрэст, Наркамлёгпрам?

Становішча фабрыкі ім добра вядома, але яны знаходзяцца ў ролі пабочных наглядальнікаў усіх негадначасьцяй, якія трымаюць фабрыку ў глыбокім сыстематычным прарыве. Замест таго, каб дапамагчы фабрычным арганізацыям перабудаваць работу цэху паліто, заваленага запасамі, Белшвэйтрэст нават забараніў перабудаваць работу цэху на самастойныя істужкі, узбуйнёныя апэрацыі, што забясьпечыла-б выкананьне як колькасных, так і якасных паказальнікаў прамфінпляну.

Больш паўгода, як на фабрыцы ні з боку Наркамлёгпраму, ні Белшвэйаб'яднаньня ніхто ня бываў. Ніякага інструктажу, ніякай дапамогі, ніякай праверкі работы і патрабаваньняў. Ці не зьяўляецца гэта лепшым доказам ігнараваньня пастановы ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб перабудове работы лёгкай прамысловасьці?

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.
„Зьвязда". М. УЗЬДЗІН.

На базу паступае паліто—суцэльны брак.

Нягледзячы на цэлы рад сыгналаў, якія былі за апошні час зьмешчаны на старонках, як мясцовага, так і цэнтральнага друку, аб дрэнная якасьці прадукцыі, выпускаемай швэйнымі фабрыкамі „Сьцяг індустрыялізацыі" і „Прафінтэрн" (апошні артыкул у газэце «Зьвязда» ад 4 верасьня), да апошняга часу якасьць выпускаемай прадукцыі ўсё яшчэ дрэнная, асабліва на фабрыцы „Прафінтэрн", дзе маецца не паляпшэньне, а пагаршэньне.

Гэта сьведчыць аб тым, што пастанова ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб рабоце прамысловасьці, аб паляпшэньні якасьці выпускаемай прадукцыі кіраўнікамі фабрыкі „Прафінтэрн" (дырэктар Варкін) яўна ігнаруюцца, аб чым сьведчыць якасьць паступаемых на базу зімніх паліто.

З самага пачатку паступленьня на базу паліто, г. зн. з 27 жніўня, яно ідзе ў большасьці брак. Так, 1 верасьня было вывернута назад на фабрыку 530 паліто, а пасьля 1 верасьня яшчэ 438 штук. Акрамя таго, значная колькасьць паліто ня вывернута з-за непаправімага браку, на якіх было ацэнка і фабрыка аштрафавана на 15.384 руб.

Брак, галоўным чынам па паліто,—ідзе за лік наступных апэрацый: крывыя лацкуны і варатвікі, заўцюжка на бок грывенкі, неправільная ўшыўка рукавоў, адна пала дзіной другой, ушыўка ўнутраных карманаў закручанымі і рукі не ўваходзяць у кішэні і цэлы рад іншых дэфектаў.

З праверанных 17 паліто, прадстаўніком фабрыкі «Прафінтэрн» АТК т. Колькіным, Дымантам, і загадчыкам АТК базы т. Фэльдманам выявілася, што большасьць паліто прапушчаны прыёмшчыкамі Смарадзінскім і Калынаватарам, якія нядбайна адносяцца да прыёмкі гатовай прадукцыі, якая павінна ісьці нашаму спажыўцу.

Нягледзячы на неаднаразовыя павіданьні аб гэтым кіраўнікам фабрыкі „Прафінтэрн", апошнія ня прымаюць да перабудовы сваёй работы і паляпшэньня якасьці выпускаемай прадукцыі ніякіх мер, а гэта нельга тлумачыць інакш, як шкоднымі адносінамі да матар'ялу. Прычым, на гэта затрачваюцца грамадзкія сродкі дзяржавы.

Трэба прыцягнуць да адказнасьці трыкутнік фабрыкі і астатніх канкрэтных вінаватых за такія адносіны да работы.

Неадкладна пакончыць з ганебным становішчам, у якім зараз фабрыка знаходзіцца, баявая задача партарганізацыі і ўсіх рабочых ударнікаў і ІТР фабрыкі „Прафінтэрн".

Загадчык АТК базы Саюзшвэйабыту
ФЭЛЬДМАН
Бракёр БАХКАН.

АД РЭДАКЦЫІ.

Артыкул зьмешчаны ў газэце «Зьвязда» і ліст работнікаў базы Саюзшвэйабыта сьведчыць аб тым, што кіраўнікі фабрыкі «Прафінтэрн» не зрабілі для сабе адпаведных вываданьняў з усіх тых матар'ялаў, якія за апошні час былі зьмешчаны на старонках друку, не ажыцьпяўляюць на справе пастановы ліпеньскага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б «аб рабоце прамысловасьці».

Ня гледзячы на тое, што фабрыцы зьвернуты назад цэлыя партыі паліто, нічога ня зроблена для паляпшэньня якасьці. Характэрна адзначыць, што нават пасьля прахаджэньня ўсіх інстанцый прыёмшчыкаў і кантралёраў, на базе выяўленых цэлыя партыі нядбайна адносяцца да прыёмкі Смарадзінскі і Калынаватар.

Фабрычныя арганізацыі «Прафінтэрн» павінны зараз-жа абмеркаваць артыкул „Зьвязды" і ліст работнікаў Саюзшвэйснабзбыта, прыцягнуць да суровай адказнасьці канкрэтных бракаробаў і вінаватых у пропуску ня добраякаснай прадукцыі, прыняць рашучыя меры да паляпшэньня якасьці.

Рэагаваньня чакаем канкрэтнымі справамі.

ЗА ЛЕПШУЮ ЯКАСЬЦЬ ПРАДУКЦЫІ, ЗА ВЫСОКУЮ ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦЬ ПРАЦЫ.



Агляд работы жактаў—справа ўсёй пралетарскай грамадзкасьці.

Вылучыць у склад праўленьняў жактаў лепшых ударнікаў.

ЗЬНІШЧЫЦЬ РАСХЛЯБАНАСЬЦЬ І РАЗГІЛЬДЗЯЙСТВА Ў ЖАКЦЕ № 5.

Фабком панчошнай фабрыкі „Клары Цэткін" вылучыў нас у наш падшэфны жакт № 5 (старшыня праўленьня Гордзін) для таго, каб азнаёміцца з працай жакта, скласьці канкрэтныя мерапрыемствы па ажыўленьні шэфства.

З чым мы сустрэліся ў жакце? Расхлябанасьць і безадказнасьць, вось што маецца ў рабоце жакта. 6 верасьня ў другі раз сарваўся сход пайнікаў, скліканы праўленьнем па пытаньні ўключэньня ў агляд работы жактаў. Замест 200 пайнікаў, на сход зьявілася толькі каля 40.

Калі актывісты жакта зрабілі абход па кватэрах у той-жа вечар, то выявілася, што асобныя пайнікі ся дзяць дома, ведаючы аб тым, што прызначан сход пайнікаў і ўпарта не жадаюць зьявіцца на сход. Вось прозьвішчы тых пайнікаў, якія ведалі аб сходзе і не зьявіліся: Васілеўскі (працуе ў ЦРБ), Тумарынсон, Гельфер (сталоўка № 32), Гелерман Баса (ТПО), Лапатухін (Белдзяржбуд), Сабецкі Сьцяпан (пажарная каманда), Кузьняцоў (чугунка), Плоцкерт (ф-ка Клары Цэткін), Мігдалевіч (працуе ў жакце), Якаўлеў (сакратар кіраўніцтва акулярнай ф-кі), Усысер (ф-ка Локерта), Паўлаў (завод Камінтэрн). Тыя, хто на праўленьні любяць многа гаварыць, а на сходах ніколі ня бываюць: Мамчыц (працуе на фабрыцы «Сьцяг індустрыялізацыі» (жакт зрабіў капітальны рамонт яго кватэры і зараз ён лічыць непатрэбным прыйсьці на сход, Гурэвіч (хатняя гаспадыня).

Праўленьнем прыняты меры, каб у трэці раз склікаць сход 12 верасьня. Задача праўленьня жакта правесьці масава растлумачальную работу сярод жыхароў, каб урэшце склікаць сход.

Далей такой расхлябанасьці і безадказнасьці ў рабоце жакта № 5 дапусьціць нельга. Неабходна ўзьняць працоўную грамадзкасьць супроць канкрэтных насіцеляў расхлябанасьці і разгільдзяйства ў рабоце жакта з тым, каб навесьці там бальшавіцкі парадак.

Рабочая брыгада панчошнай фабрыкі імя Клары Цэткін
ЛУР'Е, ІТКІНА, КАЗАЯЦ.

БЕЗАГАВОРАЧНА ВЫКАНАЦЬ ДЫРЭКТЫВЫ ГАРКОМА І ГАРСАВЕТА АБ ЖЫЛЬЛЁВЫМ БУДАЎНІЦТВЕ.

Ліпеньскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б з усёй бальшавіцкай завостранасьцю ў сваім рашэньні аб становішчы выкананьня прамфінплана прамысловасьцю падкрэсьліў і патрабаваў поўнага сканчэньня жыльлёвага і культбытавога будаўніцтва на рашаючых нашых прадпрыемствах, як панчошнай фабрыцы «КІМ», так і швэйнай „Сьцяг індустрыялізацыі".

Адначасова новае кіраўніцтва віцебскага гарсавета з мэтай канцэнтрацыі ўсёй наяўнасьці рабочых, матар'яльных рэсурсаў, забясьпечваючых сканчэньне цэлага раду аб'ектаў жыльлёвага камунальнага і культбытавога будаўніцтва, вызначыў рад аб'ектаў, якія павінны быць скончаны ў гэтым годзе абавязкова.

Аднак, паглядзім як ажыцьцяўляюцца важныя задачы жыльлёвага будаўніцтва. Асноўным паказальнікам у выкананьні пляна будаўніцтва зьяўляецца скарыстаньне сродкаў. За ліпень месяц па ўсіх ударных пабудовах скарыстана сродкаў толькі 13,7 проц. квартальнага заданьня. Тлумачыцца гэта тым, што будаўнічыя арганізацыі БЕЛПРАМБУДТРЭСТ і БЕЛКАМУНБУДТРЭСТ, не забясьпечылі пабудовы патрэбнай рабочай сілай. З патрэбных для 5 камундома 150 чал., работаюць толькі 40, на пабудове больніцы 200 рабочых—работаюць 15, на каркасных дамох панчошнай фабрыкі «КІМ» патрэбна 160, а працуюць 40. Усе пабудовы забясьпечаны ў межах ад 20 да 25 проц. патрэбнай рабочай сілы. Значыць кіраўніцтва Белпрамбудтрэсту ГАРАВЫ і Белкамунбудтрэсту АСІНАЎСКІ не заняліся сур'ёзна пытаньнем забясьпячэньня рабочай сілай першачарговых пабудоў. Пытаньне замацаваньня рабочай сілы на пабудовах павінна быць ў цэнтры ўвагі будуючыхся і будаўнічых арганізацый. У гэтай галіне трэба ўсямерна паляпшаць матар'яльна-бытавыя ўмовы рабочых.

Нельга прайсьці міма роўнадушных адносін тых прадпрыемстваў, да якіх датычацца пабудовы. Вось будуюцца дамы для фабрык «КІМ», «Дзьвіна», імя Клары Цэткін, «Сьцяг індустрыялізацыі. Фабкомы ня ведаюць як ідзе будаўніцтва, яны лічаць, што гэта іх не датычыцца. Ні разу на пасяджэньнях гэтых фабкомаў ня ставіліся пытаньне аб ходзе жыльлёвага будаўніцтва, што бязумоўна зьяўляецца з іх боку недаацэнкай гэтага пытаньня. На пабудовах яшчэ не арганізаваны сапраўдны рабочы кантроль. Рабочы кантроль павінен быць на кожнай пабудове. Ён павінен складацца з ліку рабочых і работніц, якія будуць жыць у гэтых дамох. У гэтых адносінах яўна бязьдзейнічае фабком фабрыкі „КІМ", які нават яшчэ ня вылучыў кантрольнага рабочага паста на сваіх будоўлях.

Вялізарнейшыя задачы стаяць перад прафсаюзамі будаўнічых арганізацый. Апошнія павінны так паставіць сваю работу, каб мабілізаваць шырокія масы рабочых будаўнікоў на свячасовае сканчэньне пабудоў, разгортваючы шырока сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Кіраўніцтва гаркома партыі і гарсавета патоабавала ад усіх арганізацый, якія за гэта непасрэдна нясуць адказнасьць,—сканчэньня будаўніцтва намечаных аб'ектаў у тэрмін. Трэба памятаць, што справа выкананьня планаў будаўніцтва—гэта ёсьць кроўная справа паляпшэньня матар'яльна-бытавых умоў рабочых. І мы маем усе магчымасьці, усе рэсурсы для таго, каб намечаныя аб'екты пабудаваць у тэрмін. Патрэбна толькі больш гібкасьці, апэрацыйнасьці і бальшавіцкай настойлівасьці ў барацьбе за будаўнічы плян.

ВАЎЧОК.

ПРАЎЛЕНЬНЕ ЖАКТУ № 28 ПРАЦЯГВАЕ БЯЗЬДЗЕЙНІЧАЦЬ.

Работа жакту № 28 гэта ўзор расхлябанасьці, безадказнасьці і безгаспадарчасьці. Дамо канкрэтныя і жывыя факты, якія з усёй відавочнасьцю гавораць аб тым, што жакт № 28 знаходзіцца ў глыбокім прарыве.

Праўленьне абсалютна бязьдзейнічае, ніколі ня склікаюцца сходы. На чале праўленьня знаходзіцца КАРЭЛІН, выключаны з партыі за п'янку. Гэты самы КАРЭЛІН адначасова займае пасаду і ўпраўдамі, але ніякай работы ні на адной, ні на другой пасадзе не праводзіць.

Рамонтам кватэр ніхто не займаецца. Калі работніца, член праўленьня гэтага жакту тав. ГУРЭВІЧ зьвярнулася да Карэліна з прозьбай правесьці рамонт яе кватэры, то ён адказаў: «Напішы пісьмовую паперку». Рабочыя БЭЙЛІНСОН і ЛАБОК зьвярнуліся да Карэліна зрабіць тэрміновы рамонт, то Карэлін адказвае: «Я вам не нянька, бярыце і самі рабіце рамонт». Такія бездушныя, бюракратычныя адносіны накіраваны на тое, каб сарваць справу паляпшэньня рабочага быту.

Пастановай гаркому партыі і гарсавету Карэлін зьняты з працы і аддадзены пад суд за скажэньне клясавай лініі ў рабоце жакту, бязьдзейнасьць і зрыў работы па рамонце рабочых кватэр.

Аднак, на справе КАРЭЛІН працягвае займаць пасаду старшыні жакту і ўпраўдамі.

У праўленьні жакту няма ніякага вучоту сацыяльнага складу жыхароў. Нават сам КАРЭЛІН ня ведае, хто жыве ў жакце.

Карэлін марыць заявы рабочых ударнікаў ФАЙЦІН, ЮДЗІНА і інш., аб забясьпячэньні іх лепшымі кватэрамі.

У ЖАКЦе асобныя пайнікі праўляюць агідныя адносіны да грамадзкай маёмасьці. Напрыклад: пайнікі ГАРДЗЕЯВА, КІРУК, рубяць і піляць дровы ў кватэры. У доме № 79, 30, 57-а, 57-б у кухні бруд, нават у доме № 57, дзе жыве ўпаўнаважны дамамі ХРАПАВІЦКІ кухня падобна на хлеў. І на гэта праўленьне ЖАКТу і Карэлін не зьвяртаюць увагі. А вось пайнікі ФРАДКОЎ, ШЭЙДЗІН бяз ведама ЖАКТу здаюць у арэнду кватэру, атрымліваюць за яе грошы. У ЖАКЦе маюцца фруктовыя сады, аднак яны знаходзяцца ў запушчаным безгаспадарчым становішчы, дрэвы ламаюцца, садавіну рвуць каму ня лень, і тут няма гаспадарчага вока нашага праўленьня і старшыні ЖАКТу. Калі яшчэ дадаць тое, што ЖАКТ мае запазычанасьць за пайнікамі па кватэрнай плаце на 5950 руб., то становіцца ясным, што асноўнай прычынай усяго гэтага зьяўляецца тое, што на чале праўленьня ЖАКТу стаіць чалавек, які скажае клясавую лінію ў рабоце ЖАКТу, які насаджае безгаспадарчасьць.

Для таго, каб зрабіць рашучы пералом у рабоце ЖАКТу № 28—патрэбна абраць новы склад праўленьня з ліку лепшых ударнікаў жыхароў, якія-б з дапамогай усіх пайнікаў узначалілі-б барацьбу за ўзорны ЖАКТ.

Брыгада «Віцебскага пралетарыя»
СЕНЬКОЎ, БЭЙЛІНСОН.

партыйнай пралетарскай моладзі, згрупаваць яе вакол ячэйкі, дасьць ёй магчымасьць ісьці разам з намі на вырашэньне задач, пастаўленых партыяй перад камсамолам.

Мы шмат гаворым аб тым, што ніколі ня выконваецца прамфінпляны па раду заводаў г. Менску, а камсамольцы і кіраўніцтва дапускаюць гніла ліберальныя адносіны да гэтага. Партыя ставіць пытаньне аб канкрэтнай барацьбе за выкананьне прамфінпляну на словах, а на справе, па-бальшавіцку.

Мы павінны перад камсамолам паставіць адно пытаньне ў сэнсе рытвор чай работы: аб культурнай рабоце і наглядзе за варштатам і дэтальлю. У нас у Беларусі мы прывыклі працаваць каля варштату як дзікуны. У Менску, у сталіцы гаворыць, што большасьць актыву—культурныя людзі. Калі ты з імі на актыве сустракаешся, гэта чыстыя людзі, актыўныя, культурныя; калі-ж прыедзеш на фабрыку, на завод, паглядзіш як працуюць гэтыя людзі, за галаву трэба схапіцца: гразь, усё замазана, беспарадак. А чаму нам, камсамольцам, ня ўзьняць гэтага пытаньня? Раз мы, маладыя будаўнікі сацыялізму, ударна ўдзельнічаем у барацьбе за выкананьне прамфінпляну на радзе вучасткаў самодзейстычнага будаўніцтва чаму мы павінны працаваць брудным? Чаму каля варшта у лужы? Чаму на фабрыцы брудна? А вы ведаеце, што чыстата сапраўдзі чае ўзьняцьцю прадукцыйнасьці працы, павышае якасьць нашай прадукцыі. А тут работнік лічыцца добрым камсамольцам, а працуе па пояс у гразі.

Што-ж мы павінны зрабіць? Мы павінны абвясьціць камсамольскі паход за чыстату. Трэба проста ў газэце, на сходзе прапрацаваць такога камсамольца, у якога гразь у варштата.

У нас і маюць варштаты. Абыходзяцца з варштатамі неахайна, ніхто незадумваецца над гэтым. Вывучыць варштат—не яго справа, а ламац ён майстра. Ня ведае канструкцыі, кіруку работы, нічога ня ведае, між тым лічыцца камсамольцам-ударнікам.

Варштат павінен працаваць добра, а ў нашых руках варштаты вельмі часта плачуць з за дзікага, нікуды ня вартага абыходжаньня з імі. Значыць, трэба змагацца за чыстату варштата, інакш мы працаваць ня можам, інакш мы—саматужнікі, інакш мы не камсамольцы, якія змагаюцца за высокую прадукцыйнасьць працы.

Калі мы разгарнем вакол гэтага вялікую работу, ня проста разгаворамі, а справай,—а на гэтых культурных адносінах да справы, да працы будзем выхоўваць камсамол, асабліва ў Беларусі—мы значна прасунемся наперад.

У Менску і наогул у Беларусі да пытаньня сасцпаборніцтва і ўдарніцтва існуе агульны падыход у кіраўніцтве камсамолу. Мы ня вывучаем, як па вина будавацца работа на швэйных прадпрыемствах, на мэталяапрацоўчых у тарфяной прамысловасьці.

Ці мы ў нас, у Менску дабіліся таго, каб камсамолец быў сапраўды арганізатарам за дзейсны дагавор аб сацспаборніцтве? Калі праілюстраваць тут дзесяткі дагавораў, нават да авароў, заключаных камсамолцамі, то вы самі пасьведчыце, што гэтыя дагаворы—агульныя, нічога канкрэтнага не даючыя, простыя паперкі.

Ці нам нельга дабіцца такога стаповішча, каб дагавор па сацспаборніцтве быў бы канкрэтны, з вызначанымі абавязацельствамі, з вызначанымі задачамі і тэрмінамі? Ці камсамол ня можа арганізаваць праверку выкананьня дагавора? Ці мы ня можам ахапіць хваляй сацспаборніцтва і ўдарніцтва ўвесь камсамол? Бязумоўна, можам. Ці не ганьба нам, менскай арганізацыі, калі ў вас ёсьць фабрыкі, дзе камсамольцы на 30—40 проц. ахоплены дагаварамі па сацспаборніцтве. А мы цярпім і лічымся кіраўнікамі.

Вялікая справа для камсамолу—гэта справа асваеньня тэхнікі. Тав. Косараў выдаў дакладзе на абяднаным пленуме Ленінградзкага абкому і гаркома ўсеЛКСМ асабліва за вастрыў па гэтым пытаньні ўвагу камсамолу. «Галоўнае, сказаў тав. Косараў, у аўладаньні тэхнімінімумам—гэта ўзброіць маладога рабочага такой сумай вытворчых ведаў, якая будзе сазрэмейце, — гаварыў тав. Косараў далей,—што, не аўладаўшы тэхнікай сваёй справы, малады рабочы наносіць урон дзяржаве і часта мімаволі становіцца бракаробам, ламае вартаты».

Калі прыглядзецца да камсамолу на нашых фабрыках і заводах і пагляд дзець, што ведае нават кваліфікаваны майстар, апрача вузкай сваёй справы, дык аказацца, што ён нічога ня ведае.

Калі праглядзець увесь актыў, то мала знойдзецца чытаючых хаця-б часопіс „Техніка". Ці шмат хто з актыву можа пахваліцца тым, што ўзьнімае свой тэхнічны ўзровень? Бязумоўна мала хто. Задача аўладаньня тэхнікай—вялікая задача. Без яе мы ня можам асвоіць важнейшыя задачы, пастаўленыя партыяй.

Добрую справу зробіць Менскае кіраўніцтва і ЦК, калі мы па прыкладу некаторых перадавых саюзных арганізацый абвясьцім праверку тэхнічных ведаў камсамольцаў і м ладзі.

Аб вясковым камсамоле. ЦК паслаў у вёску „шасьцісотнікаў" і яшчэ групу таварышоў на мяжу. Нам у некаторай ступені ўдалося палепшыць сацыяльны склад сэкратароў калгасных ячэек.

Калі раней мы сэкратарамі ячэек мелі вялікую колькасьць служачых, мілі дыянэраў, паштальёнаў, то зараз у асноўнай масе сэкратарамі калгасных ячэек зьяўляюцца ўдарнікі калгасьнікі.

Зараз задача райкому заключаецца ня ў тым, каб ставіць агульныя задачы перад калгаснай ячэйкай. Зараз трэба навучыць кожнага вясковага сэкратара калгаснай ячэйкі таму, як трэба працаваць і як трэба кіраваць. Навучыць яго можа старэйшы таварыш, член бюро райкому, сэкратар райкому, член ЦК, сэкратар ЦК. Калі мы выяжджаем на вёску, трэба ня толькі правесьці некалькі гадзін запытаць заўсёды, ці як ідзе ўборка, а трэба прыехаць у ячэйку і засесьці, як ідзе з актывістаў гэтай калгаснай ячэйкі, узяцца за работу так, каб той адчуў сапраўдную дапамогу.

Трэба навучыць як кіраваць—гэта будзе справа і тады і калгасьнік камсамолец, і сэкратар ячэйкі скажа: «Вось у мяне быў сэкратар ЦК, сэкратар РК, гэта баявыя хлопцы, не трапаліся, а прыехаўшы паглядзелі стайню, далі на раду, расставілі сілы, пайшлі ў брыгаду, расказалі, як трэба рабіць, як трэба камсамольцу чытаць газэту,—гэта сэкратар не трапач".

ЦК і райкомы павінны перабудаваць сваю работу іменна ў напрамку дапамогі ячэйцы, інакш нічога ў нас ня выйдзе.

У нас ёсьць камсамольцы-ўдарнікі, якія ня дрэнна працуюць. Трэба іх навучыць быць ударнікамі ў брыгадзе. Менскі актыў вельмі дрэнна ведае вёску. Гэта трэба нам улічыць і ўзяцца за дапамогу вёсцы па бальшавізацыі. Гэта дасьць вельмі шмат. На вёсцы для чалавека, які хоча быць у гушчыні мас, работы шмат. Чалавек, які не гаслаўлюе, а прыяжджае на вёску для таго, каб паказаць сабе, як арганізатар, як бальшавік.—гэты чалавек, папрацаваўшы ў калгаснай ячэйцы, у калгаснай брыгадзе, на галаву вырасьце вышэй.

Мы ў Беларусі ў кожнай брыгадзе вылучаем агітатара, чытача. ЦК даў указаньне вылучыць 2000 чытачоў, але гэта яшчэ пачатак работы. Трэба заняцца і гэтымі чытачамі. Камсамольца трэба навучыць чытаць, трэба яму растлумачыць, параіць, калі ён павінен і што ён павінен чытаць і арганізаваць яго папраўляць.

Ёсьць паасобныя сэкратары РК, культпропы, якія адпавядаюць свайму прызначэньню, але большасьць адкрыта кажучы, не адпавядае сваёй рабоце. Надзвычай узмацніць работу ў ёсцы палітаддзелы саўгасаў і МТС. Палітаддзелы яшчэ больш умацавалі нашу арганізацыю. Задача заключаецца ў тым, каб мы ўсімі сіламі дапамагалі ў іх рабоце. Трэба рашуча змагацца з усялякага роду спробамі асобных работнікаў ігнараваньня палітаддзельскай работы. І гэта на нас накладае вялікую адказнасьць па дапамозе ў выкананьні імі пастаўленых партыяй задач. Мы павінны умацаваць кіраўніцтва зьверху давізу. І гэта неабходна ў Беларусі, дзе камсамольская арганізацыя моцна засьнежана.

У парадку выкананьня пастановы ЦК УсеКП(б) мы рашылі выклікаць прыбліжна усіх сэкратароў РК, культпропаў ваенных работнікаў для праверкі. І што-ж мы зробім з гэтымі кіраўнікамі раёнаў? Возьмем, скажам, сэкратара Капыльскага ці Дзяржынскага раёну, праверым яго з пункту гледжаньня веданьня справы, здол насьці кіраваць. Калі ён „шляпа" —зьнімаем з работы, а калі ён працуе — дапаможам яму, дамо параду. Прыедзем ся па ўсім кіраўніцтве і толькі тады будзем упэўнены, што будзе ўсё добра. Навучым гэтых людзей канкрэтна падыходзіць да справы.

Аб тэхнічных ведах. Мне здаецца, што ў вёсцы трэба правесьці нарэшце нальную праверку камсамольцаў калгасьнікаў, як яны авалодваюць аграмінімумам. Яны ведаюць вузка сваю справу і ня ведаюць аграмінімуму, аграправаіл. Гэта можна сказаць ня толькі аб радавых камсамольцах, а таксама і аб кіраўніцтве, аб сэкратарох РК.

На зьез дзе калгасьнікаў Цэнтральны камітэт даручыў мне паставіць пытань не перад камсамольцамі-калгасьнікамі аб арганізацыі культурнага жыцьця калгасьніка. У калгасе вельмі часта бывае так: на полі, на стайні наш камсамолец-калгасьнік добры ўдарнік, але як прыйшоў дамоў—не адрозьніш калгасьніка - ударніка, сам самолец ад аднаасобніка: тая ж гразь, смурод.. А чаму б не ўзьняць культурны паход у вёсцы за тое, каб камсамолец быў чысты, не абадраны, прышываў сабе гузікі, каб ён вызначаўся з вонкавага выгляду. Мы можам гэта зрабіць і зробім.

Калі паглядзець, дзе мяцца калгасьнік, дык трэба сказаць, што ў яго яшчэ дзедаўская лазьня. Ці мы ня можам у калгасе мець культурную лазьню? Чаму-б нам не пабудаваць у калгасе лазьню чыстую, сьветлую? У гэтым задача. Гэта дробязная, здаецца, пытаньні, але-ж вакол іх разгортваецца вялікая палітыка, вялікая работа. І мне здаецца, што барацьба за культурнае жыцьцё калгасьніка—гэта вялікая задача.

Зараз ідзе ўборка і здача збожжа дзяржаве. Мы абвясьцілі сацыялістычны канвэр па ўборцы, абмалоце і здачы дзяржаве збожжа. Пакуль што ні якага камсамольскага канвэеру няма. Мы адстаем ва ўборачнай кампаніі і здачы збожжа дзяржаве і гэта кладзе на нас ганебную пляму. У нас камсамольцы кепска ўбіраюць, ў нас сэкратары РК не націскаюць на абмалот і на здачу збожжа дзяржаве. Абавязак камсамола заключаецца зараз у тым, каб арганізаваць барацьбу з кулаком, злодзеем грамадзкай уласнасьці.

А як мы працуем з сёньнешнім аднаасобнікам—заўтрашнім калгасьнікам? Трэба про та сказаць, што камсамол працуе на звычай нездавальняюча. Гэта недапушчальна. Наш простага абавязак неадкладна палепшыць работу з аднаасобнікам. Мала-ж то ўкі агітаваць аднаасобніка зь калгас, трэба паглядзець, як ён сеяў, як убірае, ці свае часова ён малоціць і з ае збожжа дзяржаве. Трэба дапамагчы прапоўнаму аднаасобніку лепш убраць ураджай, хутчэй і лепш абмалаціць растлумачыць яму пастановы ўраду аб збожжаздачы, дабіўшыся таго, каб кожны працоўны аднаасобнік своячасова выканаў абавязак перад дзяржавай, ашуча змагаючыся з рознымі відамі перагібаў і «лапшакоў» адміністратарскіх адносін да аднаасобнікаў.

Цэнтральны камітэт УсеЛКСМ рэзка і зусім правільна ўскруў і паказаў нам рад важнейшых недахопаў і памылак у нашай практычнай рабоце. І на самой справе, усе мерапрыемствы і работа ЦК ЛКСМБ, пры ўсё яшчэ незадавальняючым стане камсамольскай арганізацыі, яўна невыстарчальны. Мы не кіравалі апэрацыйна раёнамі, яйкамі, слаба дапамагалі адстаючым арганізацыям. У практыцы кіраўніцтва як ЦК, так і мясцовых арганізацый, усё яшчэ шмат агульнасьці, канцылярызму ва ўрок жывому інструктажу і дапамозе. Праводзячы правільную лінію у рабоце, мы на практыцы прахлопалі міма раду буйнейшых памылак, часам палітычнага характару.

Вялікім з ом на ўсёньняшні дзень зьяўляецца недысцыплінаванасьць ся род актыву. Мы яшчэ не навучыліся, раз прыняўшы рашэньне, да канца ама гацца за тое, каб выканаць яго поўнасьцю і ў тэрмін, нам яшчэ не хапае сур'ёзных, бальшавіцкіх адносін да справы. Неаднаразовыя ўказаньні ЦК УсеЛКСМ аб праверцы выкананьня намі (ЦК ЛКСМБ, ГК і РК) дрэнна выконваюся.

Аб вайсковай рабоце. Калі мы прыехалі сюды шчацаваць мы моцна на ціснулі на пытаньне аб ўмацаваньні граніцы і вывучэньні вайсковай справы. Мы шмат чаго дасягнулі ў гэтым пытаньні, грунтуючыся ў пытаньні вайсковага навучаньня камсамол цэў мы ня спыніліся, а ўказаньня наперад. Але гэта нас не задавальняе. Мы павінны быць першай распублікай у Савецкім саюзе, якая добра навучана, добра ведае ваенную тэхніку.

На пытаньне вайсковай падрыхтоўкі маладых людзей—здаровых, моцных, гатовых да працы і абароны мы павінны і ў далейшым зварачаць асаблівую ўвагу. А ці ўсе мы, камсамольцы, здалі нормы на ГПА" і варашылаўскіх стрэлкамі.

За гэтыя паўтары гады ЛКСМБ у справе бальшавізацыі сваіх радоў і кіраўніцтва мае рад посьпехаў, галоўным чынам таму, што ЦК КП(б)Б штодзённа сачыў, выпраўляў і дапамагаў нам у нашай дзейнасьці, моцна паб льшаўшы ставіў перад намі практычныя задачы нашай работы, вучыў і вучыць нас працаваць. Асабліва трэба адзначыць на тэй вялікай, сапраўды бальшавіцкай ролі ў пытаньні паляпшэньня парткіраўніцтва камсамолам і выкананьня ня улых неапайных адносін раду кіруючых партыйных і савецкіх прафсаюзных органаў да камсамолу, ролі, як ю адыгрывае сэкратар ЦК КП(б)Б тав. Гікало.

Шмат яшчэ недахопаў у кіраўніцтве райкомаў і парт'ячэек камсамолам. Пастанова аргбюро ЦК УсеКП(б) па дакладу „аб становішчы камсамолу Беларусі і парткіраўніцтва ім" і задачы, якія паставіў перад намі ЦК УсеЛКСМ —ёсьць бальшавіцкая праграма для ўсіх парткамітэтаў рэспублікі ў справе канкрэтнага кіраўніцтва і дапамогі камсамолу.

ЦК УсеЛКСМ, улічваючы асаблівасьці і дзяжас ці нашай работы ў БССР вельмі часта на бальшавіцку, выразна і моцна займаўся намі і ня толькі займа ся, але апэрацыйна як належыць бальшавікам - кіраўнікам, канкрэтна раіў, дапамагаў нам у бальшавізацыі і перабудове арганізацый і кіраўніцтва.

Камсамол Беларусі павінен яшчэ больш актывізавацца ў барацьбе за правільнае ажыцьцяўлен не ленінскай нацыянальнай палітыкі, даючы сакрушальны адпор усякім праўленьням шавінізму і імкненьням контр-рэвалюцыйных элементаў скарыстаць асобныя зьвяньні нашай арганізацыі. Камсамольцы Беларусі павінны быць адзін да аднаго моцна згуртаванымі, узброенымі на барацьбу за задачы нашай партыі Саюзу і павінны, выхоўваючы сябе заўсёды памятаць указаньні тав. Кагано віча аб тым, што „Камсамолец—палітык, палітык—бальшавік".

Зараз прыступаючы да рэалізацыі пастановы ЦК УсеЛКСМ, памятаючы далейшыя практычныя нашы дзеяньні кожны камсамолец ячэйка, камітэт павінны на аснове бальшавіцкай самакрытыкі праверыць сваю работу.

Разгортваючы сапраўды бязь

УСЕБЕЛАРУСКІ ДЭКАДНІК САЦСПАБОРНІЦТВА ПА ФІНПЛЯНЕ.

Вышэй сьцяг сацспаборніцтва у барацьбе за выкананьне фінпляну па усіх паказальніках!

Ахопім кожнага новага рабочага, кожнага калгасьніка падпіскай на пазыку, поўнасьцю рэалізуем пазыку сярод працоўных аднаасобнікаў! Ніводнага рубля запазычанасьці па ўзносах!

АТРЫМАЕМ ПЕРАМОГУ НА ФІНАНСАВЫМ ФРОНЦЕ!

Сёньня адбудзецца нарада трыкутнікаў з удзелам старшынь камсодаў па пытаньні папярэдняга падагульваньня вынікаў дэкадніка спаборніцтва па датэрміновому выкананьню фінансавага пляна.

Трэба адзначыць, што у гэты дэкаднік спаборніцтва ня ўсе прадпрыемствы і ўстановы ўключыліся. На сёньняшні дзень мы маем на радзе прадпрыемстваў шмат рабочых, якія не ахоплены падпіскай па пазыку „Першага году другой пяцігодкі" (фабрыка „Сьпяг індустрыялізацыі", керамічныя заводы, «Дзьвіна», лесзавод імя «Правды» і г. д.).

Асабліва пагражаючае становішча з рэалізацыяй пазыкі сярод працоўных аднаасобнікаў. За восем дзён верасьня рэалізавана пазыкі па аднаасобным сэктары ня больш 200 руб. Віцебскі сельсавет прадаў за наяўны разьлік аднаасобнікам пазыкі на суму 30 рублёў. Пасланыя з гораду брыгадзіры не дабіліся рашучага пералому на гэтым участку выкананьня фінпляну 3 квартала.

Нарада трыкутнікаў павінна намеціць канкрэтныя мерапрыемствы, якія-б забясьпечылі 100 процантае выкананьне фінпляну 3-га кварталу па ўсіх відах да 15 верасьня. Трэба моцна ўдарыць па апартуністах і бяздзейнікам, якія зрываюць выкананьне фінпляну.

Мы павінны атрымаць у спаборніцтве з Менскам, Гомелем і Ярцавым перамогу на фінансавым фронце. Трэба разгарнуць сапраўды бальшавіцкую барацьбу за фінплян, за выкананьне яго па ўсіх паказальніках. Вышэй сьцяг сацыялістычнага спаборніцтва паміж фабрыкамі, цэхамі, сельсаветамі, калгасамі і брыгадамі ў барацьбе за датэрміновае выкананьне фінпляна 3 квартала!

Спаборніцтва ашчадкас.

ПЯРШЫНСТВА ПАКУЛЬ ЗАСТАЕЦЦА ЗА КАСАЙ № 3.

Касы № 2 і 5 павінны неадкладна ліквідаваць сваё адставаньне.

За 6 дзён верасьня прыліў па ўкладах у ашчадныя касы складае 26.160 руб.

Пяршынства ў спаборніцтве ашчадных кас застаецца за КАСАЙ № 3. У гэтай касе за першую пяцідзённку верасьня прыліў складае 10.573 руб. Падтрымваецца цэнтральная ашчадная каса, якая за пяцідзённку дала прыліву 11.218 руб., каса № 135—4.047 руб.

Плятуцца ў хвасьце каса № 2, якая за 5 дзён дала толькі 323 руб. прыліву. Каса № 5 зноў дала адліў. Задача цэнтральнай ашчадкасы і касы № 3 узяць на буксір касы № 2 і 5, выцягнуць іх з глыбокага прарыву па прыцягненьні ўкладаў.

АМАТАРЫ АВЯЦАНАК З ФАБРЫКІ ІМЯ ЛЕКЕРТА.

Руйнуючы ўдар па апартуністычных адносінах да барацьбы за выкананьне фінпляну.

120 рабочых яшчэ не ахоплены падпіскай на пазыку на фабрыцы імя ЛЕКЕРТА. Сакратар парткалектыву ЛЕВІН, дырэктар ХАЙКІН, старшыні камсоду КУГЕЛЬ і фабкому ГОЛЬБРАЙХ увесь час «абяцалі», што яны ў блізкійшыя дні ахопяць падпіскай на пазыку ўсіх рабочых, але іх абяцаньні засталіся пустым гукам. Замест павялічэньня падпіскі, гэтыя аматары абяцанак далі зьніжэньне на 9000 рублёў. Рэдактар шматтыражкі КРЭНДЗЕЛЬ, ня гледзячы на ўзятае на нарадзе рэдактараў самаабавязацельства, ўсё яшчэ не ўзяўся за работу. Штодзённі вельмі слаба змагаюцца за рэалізацыю пазыкі і мабілізацыю сродкаў.

Партыйны калектыў абазваны без адкладна ліквідаваць такое ганебнае адставаньне па пазыцы і ўкладах у ашчадную касу. Фабрыка імя Лекерта мае ўсе магчымасьці быць у перадавых шэрагах і гэтага яна абавязана дабіцца на аснове разгорнутай шырокай масава-арганізацыйнай работы сярод рабочых і служачых, на аснове мабілізацыі ўсяго фінактыву на датэрміновае выкананьне фінпляну.

МІРЫНГОФ.

Дабіцца рашучага пералому!

Нягледзячы на рад сыгналаў газэты, партыйная ячэйка, фабком, камсод і дырэкцыя голкавай фабрыкі не зрабілі рашучага пералому ў працоўце па выкананьні фінансавага пляну трэцяга кварталу. Фабрыка ў конкурс-спаборніцтва ўключылася фармальна.

На сёньняшні дзень яшчэ не ахоплена 15 рабочых падпіскай на пазыку. Акрамя гэтага, падпісны ліст на 12 рабочых на суму 970 руб. валяецца ў кішэні члена камсоду ГОРФУНКЕЛЬ з 25 жніўня. У цэхох не разгорнута ніякай масавай работы.

ЦУКЕРМАН.

ДА АДКАЗНАСЬЦІ ЗРЫЎШЧЫКАЎ ПЕРАЛІЧЭНЬНЯ ГРОШАЙ ПА ПАДПІСЦЫ НА ПАЗЫКУ.

Неадкладна пералічыць грошы Дзяржбанку.

Наступныя прадпрыемствы і ўстановы не пералічваюць Дзяржбанку прылічваючыяся з іх грошы па калектыўнай падпісцы сярод рабочых і служачых па пазыку: інструмэнтальна-мэблёвая фабрыка (запазычанасьць складае 2.338 руб.), панчошная фабрыка „КІМ"—4.613 руб., кантора сувязі—1.723 руб., скурзавод—1.990 руб., фабрыка канцпрыладаў—1.458 руб., кіраўніцтва трамваю—2 588 руб., санаторыя «Сасноўка»—721 руб

За злачыннае непералічэньне грошай па пазыцы, РСІ павінна прыцягнуць кіраўнікоў прадпрыемстваў і ўстаноў да суровай адказнасьці. Грошы павінны быць на працягу аднаго дня пералічаны Дзяржбанку!

Н.

Ніводнага працоўнага аднаасобніка без аблігацыі пазыкі!

Па Рудакоўскім, Ялагінскім і Даўжанскім сельсаветах за апошнюю пяцідзённку спагнана па абавязковых плацяжох 39847 руб. З іх Даўжанскі сельсавет спагнаў 17.477, Рудакоўскі — 15.941, Ялагінскі—6.429.

Адстае паступленьне па страхоўцы.

Задача сельсаветаў яшчэ больш напрудзіць сілы для таго, каб у бліжэйшыя дні канчаткова завяршыць плян мабілізацыі сродкаў 3-га кварталу. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на рэалізацыю пазыкі сярод аднаасобнага сэктару і паступленьне ўзносаў па калектыўнай падпісцы калгасьнікаў. Трэба паставіць перад сабой задачу, каб да агульнараённага зьезду фінударнікаў ніводнага працоўнага аднаасобніка не засталося без аблігацыі пазыкі.

ЛЕВІН.

Фашысцкія меры „барацьбы з беспрацоўем".

БЭРЛІН, 7. Барацьба супроць працуючых без рэгістрацыі на біржы працы і супроць асоб „з падвойным заработкам" пачынае прымаць усё больш рэзкія формы. Паміма пагрозы канцэнтрацыйным лягерам, у радзе месц вытвараюцца аблавы. Камісар Берліна ЛІП�КЕРТ абвясьціў, што заказы будуць давацца толькі тым фірмам, якія заявяць, што яны ня будуць дапускаць да работы асоб з падвойным заработкам, а таксама незарэгістраваных на біржы працы. Усе гэтыя меры выклікалі шырокае незадавальненьне.

Кіраўнік дзяржаўнага кіраўніцтва па працоўнаму пасрэдніцтву і страхаваньню па беспрацоўю выдаў распараджэньне, у якім указваецца, што германскі ўрад у бліжэйшы час займецца гэтым пытаньнем Усім органам працоўнага пасрэдніцтва прапануецца ўстрымлівацца ад вырашэньня гэтых пытаньняў у мясцовым маштабе.

ГРАМАДЗКІ СУД НАД САПРАЎДНЫМІ ПАДПАЛЬШЧЫКАМІ РЭЙХСТАГА.

ПАРЫЖ, 7. 11 верасьня ў Парыжы, ў залі Ваграм, адбудзецца грамадзкі суд над падпальшчыкамі рэйхстага, які арганізуецца камітэтам дапамогі ахвярам германскага фашызма і міжнароднай лігай барацьбы з антысэміцызмам. Адвакаты Моро Джыафэры і Торэс кажуць прамовы, якія яны выкінулі-б на працэсе ў Лейпцыгу, калі-б германскія ўлады дапусьцілі іх да абароны.

Старшынём на судзе будзе праф. Ляншэвэн. У ліку другіх выступяць Бэртэры, Моннэрвіль, шведзкі адвакат Брэнцінг.

Кампартыя заклікае працоўных зьвяцца на гэты грамадзкі суд!

Нацыянал-сацыялісты рыхтуюць забойства прафэсара Эйнштэйна.

ЛЁНДАН, 7. «ДЭЙЛІ ГЕРАЛЬД» паведамляе, што нацыянал сацыялісцкая тэрарыстычная група ўключыла прафэсара ЭЙНШТЭЙНА ў свой сьпісак «прыгавораных да сьмерці» і вызначыла за яго забойства ўзнагароду ў тысячу фунтаў стэрлінгаў.

Пляны нацыянал-сацыялістаў у Скандынавіі і Прыбальтыцы.

СТАКГОЛЬМ 7. Парыскі карэспандэнт газэты „АРДЭТАРЭН" паведамляе, што зьезд германскіх нацыянал-сацыялістаў у Нюрэнбэргу рашыў разгарнуць нацыянал-сацыялісцкую пропаганду ў СКАНДЫНАВІІ і ПРЫБАЛТЫЦЫ з мэтай «ператварыць палітычнае жыцьцё гэтых краін па германскаму прыкладу», каб потым дабіцца аб'яднаньня гэтых краін з Германіяй.

Прыгавор па справе беларускіх рэвалюцыйных сялян.

ВАРШАВА, 8. Кобрынскім палявым судом вынесен прыгавор па справе беларускіх рэвалюцыйных сялян. Справу КАПЛАН пастаноўлена перадаць для разгляду ў парадку нармальнага судаводзтва. Астатнія абвінавачаныя (8 сялян) прыгаворваны да пажыцьцёвай турмы.

Рэвалюцыйныя падзеі на Кубе.

НЬЮ ЁРК, 7. Паводле паведамленьня з ГАВАНЫ, у правінцыі ОГЫЕНТЭ рабочыя захапілі тры буйныя цукровых заводы, якія належаць прамыслоўцам ПАЗШ і завод кубінскага ўласьніка. Па словах газэт, рабочыя, кіруемыя камуністамі, пагрозай затопу прадпрыемствам дамагаюцца павышэньня зарплаты. Рад камісьтраваў цукровых заводаў ПАЗШ уцёк.

Паведамляюць аб арышце многіх актывістаў кампартыі і рабочых, якія распаўсюджвалі рэвалюцыйную літаратуру сярод салдат. Арганізуемая камуністамі масавая дэманстрацыя забаронена. Нягледзячы на рэпрэсіі, рэвалюцыйны пух расьце.

У ПАЗШ ня верацъ трываласьці хунты (кіруючага камітэту) і ўзмацняюць падрыхтоўку да інтэрвэнцыі. Амэрыканскі крэйсэр і некалькі контрмінаносцаў прыбылі ў Гавану. Эскадрыльні самалётаў, уключаючы бамбавозы, загадана быць гатовай да ад праўкі на Кубу. Адначасова друк узмоцнена прапагандуе інтэрвэнцыю.

НЬЮ ЁРК, 7. Аддан загад аб дадатковай адпраўцы 16 контрмінаносцаў у кубінскія воды. Усяго ў Кубу накіравана 30 новых суднаў флёта ПАЗШ.

ГЕРМАНСКІ ДРУК АБ ГЕРМАНА-САВЕЦКІХ ГАСПАДАРЧЫХ АДНОСІНАХ.

ВЭРЛІН, 7. „ДЭЙЧЭ БЭРГВЭРКСЦЭЙТУНГ" указвае, што Германіі неабходна імкнуцца да павялічэньня ўвозу савецкай нафты. Гаворачы аб неабходнасьці агульнага павялічэньня савецкага экспарту ў Германію, газэта падкрэсьлівае, што гэта „цяпер галоўная ўмова захаваньня і ўмацаваньня германа-савецкіх гаспадарчых адносін".

ЭДУАРД ЭРЫЁ Ў МАСКВЕ.

МАСКВА, 8. Вечарам, 7 верасьня, п. ЭДУАРД ЭРЫЁ, францускі пасол п. ШАРЛЬ АЛЬФАН і спадарожнікі п. Эрыё прыстанчылі на прадстаўленьні ў Дзяржаўным акадэмічным малым тэатры.

8 верасьня п. Эдуард Эрыё, дэпутат Марген і п. Марсэль Рэй наведалі Крэмль і падрабязна агледзелі Аружэйную палату і інш.

П. Эдуард Эрыё вельмі захапіўся чырвонай і чорнай дошкамі і паказальнікамі выкананьня пранфінпляну вытвараючыхся ў Крэмлі будаўнічых работ. Ён сяброўскі вітаў прадстаўленых яму лепшых брыгадзіраў-ударнікаў, занесеных на чырвоную дошку.

8 верасьня адказны рэдактар „Известий ЦИК СССР" т. Р. М. ГРОНСКІ наладзіў у гонар Эдуарда Эрыё сьнеданьне.

На сьнеданьні, апрача п. ЭДУАРДА ЭРЫЁ, прысутнічалі французкі пасол п. ШАРЛЬ АЛЬФАН, сэнатар СЭРЛЕН, дэпутаты МАРГЕН і ЖУЛЬЕН, МАРСЭЛЬ РЭЙ, дарадца францускага пасольства п. ПАЙЯР, карэспандэнт парыскай газэты „Эўр" ТАБУЛЫ, карэспандэнт „Пці парызьен" і „Тан" п. В. ЛЮСІЯНІ, карэспандэнт польскага тэлеграфнага агенцтва г. БЭРСОН, а таксама члены рэдкалегіі «Известий» т. КАРЛ РАДЭК, т. Н. ОСІНСКІ, член бюро рэдкалегіі „Правды" т. Л. З. МЭХЛІС, адказны кіраўнік ТАСС тав. Я Г. ДАЛЕЦКІ, т. ДЗЯМ ЯН БЕДНЫ, адказны рэдактар «За индустриализацию» т. ТАЛЬ, адказны рэдактар «Экономической жизни» т. МАЙМІН, адказны рэдактар «Труда» т. ТУМАРКІН, загадчык аддзелу друку Народнага камісарыяту замежных спраў УМАНСКІ, адказныя работнікі Наркамзамспраў ГЕЛЬФАНД, МІРОНАЎ, прадстаўнікі раду іншых органаў друку і супрацоўнікі «Известий».

Тт. Карл Радэк і Дзям'ян Бедны абмаляліся з Эдурдам Эрыё прывітальнымі прамовамі.

На зьезьдзе ангельскіх прафбюракратаў.

БРАЙТОН, 8. На зьезьдзе трэд-юніёнаў адбыліся спрэчкі па асноўнаму пытаньню абвесткі дня—аб дыктатуры Сакратар генсавету СІТРЫН, датыкаючыся становішча ў Германіі, спрабаваў апраўдаць здрадніцтва сацыял дэмакратыі шляхам дэмагагічных вылазак супроць германскай кампартыі. Тым ня менш, Сітрын вымушан быў прызнаць, што 18 лютага германскія сацыял-дэмакраты п ведамілі амстэрдамскаму інтэрнацыяналу, што яны ўстрымаліся ад абвяшчэньня ўсеагульнай стачкі, сьцерагучыся «сур'ёзных выніка ў да грамадзянскай вайны ўключна».

Далей Сітрын выступіў з нападкамі супроць брытанскай кампартыі і заявіў, што прафсаюзы павінны няўхільна стаяць на глебе «дэмакратыі».

Рэзалюцыя генсавету, загатоўленая зьезду, утрымлівала рад адкрытых антысавецкіх выпадаў. Сітрын ўвагуле сьледваў асноўным лініям гэтай рэзалюцыі, але вымушан быў, улічваючы настрої мас абыйсьці мяўчаньнем гэту частку рэзалюцыі. Аднак, ён не прамінуў зрабіць рад ускосных антысавецкіх выпадаў.

У спрэчках па выступленьні Сітрына выступілі два прадстаўленых на зьезд дзе камуніста—дэлегат Манчэсьцерскага саюзу работнікаў гатэляў адзеньня МАЙКОП і дэлегат паўднёва уэльскіх гарнякоў Івэнс з прапановай аб адхіленьні той часткі рэзалюцыі генсавету, якая была накіравана супроць СССР. У заключэньне Майкоп заявіў, што савецкая канстытуцыя прадстаўляе вышэйшую форму дэмакратыі, калі не будзь вядомую ў гісторыі» і указаў на фактычны ўдзел працоўных мас у кіраўніцтве савецкай дзяржавай.

Івэнс пачаў прамову з заявы, што выступае не ад імя паўднёва уэльскай фэдэрацыі гарнякоў, а ад імя 5 тыс. рабочых антрацытавых шахт Паўднёвага Уэльса, абвясьціўшых тыдзень назад стачку пэўпрэкі дырэктывам прафбюракратыі. У сваёй прамове ён у яркіх фарбах абмаляваў кантраст паміж рэзультатамі дзейнасьці германскіх сацыял-дэмакратаў, стаўшых за ўладзе ў 1918 г і дасягненьнямі Савецкага саюзу. Далей ён ўказаў на дасягненьні германскай кампартыі, праводзячай вялікую работу ў цяжкіх умовах пад польля.

Рад дэлегатаў, у тым ліку, старшыня саюзу гандлёвых служачых, які на ведаў нядаўна СССР, выступіў з адповедзьбю антысавецкаму выпаду Сітрына.

Сітрын у заключнай прамове спрабаваў заахвоціць антысавецкія выступленьні, але ніхто ня выступіў у абарону антысавецкай часткі рэзалюцыі генсавету.

Рэзалюцыя генсавету была прынята зьездам.

На зьезьдзе выразьліва стварыўся канфлікт паміж антысавецкімі выпадкамі прафбюракратыі і неабходнасьцю для яе лічыцца з растучай сымпатыяй мас да СССР. Гэта выявілася пры канчатковым прыняцьці рэзалюцыі па пытаньні аб ажгла савецкім гандлі. Як паведамлялася першапачатка ая рэдакцыя рэзалюцыі прадугледжвала зварот да брытанскага ўраду з прапановай у найкарацейшы тэрмін аднавіць англа-савецкую гандлёвую згоду. У далейшым, аднак, па ініцыятыве сакратара саюзу транспартнікаў БЭЗІНА ў тэкст рэзалюцыі была ўнесена папраўка, у моц якой зварот быў адрасаваны ня толькі брытанскаму ўраду, але і Савецкаму ўраду. Тым самым прафбюракраты спрабавалі паслабіць значаньне рэзалюцыі, даючы зразумець, што перагоды да аднаўленьня гандлёвай згоды выклікаюцца таксама паводзінамі СССР.

10 верасьня, а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні Палаца працы (пакой № 11) адбудзецца

НАРАДА ТРЫКУТНІКАЎ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ І СТАРШЫНЬ КАМСОДАЎ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ, УСТАНОЎ І СЕЛЬСАВЕТАЎ.

КАМІСІЯ ГК КП(б)Б ПА ПРАВЯДЗЕНЬНІ ДЭКАДНІКА САЦСПАБОРНІЦТВА

11 верасьня, роўна а 8-ай гадз. увечары ў памяшканьні гаркому ЛКСМБ адбудзецца АГУЛЬНЫ СХОД КАМСАМОЛЬЦАЎ—ВУЧНЯЎ ШКОЛ ФЗС і ФЗД.

Яўка абавязкова.

ГАРКОМ ЛКСМБ.

Выкананьне жнівеньскага пляну загатовак ільнанасеньня ганебна сарвана.

Бязьлітасны ўдар па агентуры клясавага ворага, якая спрабуе сарваць загатоўкі! Перавыканаць верасьнёўскі плян, пакрыць запазычанасьць за жнівень!

На 1 верасьня па раёну загатоўлена 1373 кілёграма ільнанасеньня, што складае 7,93 проц. жнівеньскага пляну загатовак. Ільнанасеньня паступіла толькі з калгасаў БАБІНІЦКАГА, СТАРАСЕЛЬСКАГА і ШУМНЯНСКАГА сельсветаў. Ад аднаасобнікаў не паступіла НІВОДНАГА КІЛЕГРАМА.

Такое ганебнае становішча з загатоўкамі ільнанасеньня сьведчыць аб тым, што абсалютная большасьць партыйных ячэек, сельсветаў і праўленьняў калгасаў ня ўлічыла дырэктыў ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб правядзеньні ўборкі, апрацоўкі і загатовак ільну і канапель. З другога боку мы бачым абсалютна нездавальняючую, проста шкодніцкую дзейнасьць Загатільна, які патурае кулацкім элемэнтам, не арганізаваў прыёмкі ільнанасеньня, проста зрывае яе.

Пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б паставіў „перад партыйнымі, савецкімі арганізацыямі задачу дабівацца выкананьня пляну ільнапеньказагатовак на месяц раней устаноўленага партыяй і ўрадам тэрміну". Гэта абавязвае партыйныя ячэйкі, сельсветы і калгасы неабходна разгарнуць вялізарную палітычна масавую работу па загатоўках ільнанасеньня, дабіваючыся неадкладнага сканчэньня церабленьня ільну, разгортваючы ўдарнымі тэмпамі расьцір яго і падрыхтоўку да першапачатковай апрацоўкі і здачы дзяржаве ільна валакна ВЫСОКАЙ ЯКАСЬЦІ, ня кіжэй 8 нумару у адпаведнасьці з пастановай гаркому КП(б)Б трэба «арганізаваць у кожным калгасе групы калгасьнікаў па церабленьню ільну і па яго расьцілу ў такой колькасьці, каб у бліжэйшыя дні скончыць церабленьне і расьціл ільну, не зрываючы іх (групы) з гэтай работы да канца ўборкі ільну. Арганізаваць усьлед за церабленьнем адлучэньне валакн ад валакн, прасушку валакн, іх малацьбу і неадкладны расьціл ільну.

Перад намі стаіць сур'ёзнейшая і адказнейшая задача: у верасьні перавыканаць верасьнёўскі і пакрыць недавыкананьне жнівеньскага пляну загатовак ільнанасеньня. Гэта можа быць дасягнута ў тым выпадку, калі кожны сакратар партячэйкі, старшыня сельсавету і калгасу ўлічыць урокі загатовак тэхкультур мінулага году на Віцебшчыне, улічыць паказаньні, дадзеныя ліпеньскім пленумам ЦК і ЦКК КП(б)Б. Трэба падкрэсьліць, што за правядзеньне загатовак тэхкультур нясе непасрэдную адказнасьць кіраўнік сельсавету і калгасу.

Трэба неадкладна праверыць работу канторы Загатільну, апарат яго, ачысьціўшы апошні ад чужароў і клясава-ворожых элемэнтаў.

Разгортваючы шырокую палітычна-масавую работу сярод калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў, нанесячы руйнуючы ўдар па спробах кулака і яго апартуністычнай агентуры сарваць выкананьне пляну загатовак тэхнічных культур, дабіцеся выкананьня гэтых пляноў на месяц раней устаноўленага партыяй і ўрадам тэрміну.

КУЛАЦКІМ ЭЛЕМЭНТАМ ДАДЗЕНА... АДТЭРМІНОЎКА.

Да суровай адказнасьці кулацкіх агентаў, неадкладна выправіць грубейшае скажэньне дырэктыў партыі і ўраду.

Перад намі плян загатовак ільнанасеньня і ільнавалакна ў разрэзе кожнага сэктару паасобку. Справа вельмі добрая, калі кантора Загатільну ведае, колькі павінен здаць, згодна кантрактацыйнага дагавору, кожны калгасьнік, працоўны аднаасобнік у жніўні і верасьні. Такія апэрацыйныя пляны разасланы па ўсіх сельсаветах. Але нас вельмі зьдзіўляе, чаму гэта кіраўнікі Загатільну ў сваім апэрацыйным пляне па загатоўках ільнанасеньня далі АДТЭРМІНОЎКУ КУЛАЦКА-ЗАМОЖНАЙ ЧАСТЦЫ?

У графе апэрацыйнага пляну здачы ільнанасеньня калгасамі і працоўнымі аднаасобнікамі паказана, што ў жніўні месяцы павінна быць здадзена ільнанасеньня 10 проц. пляну. Для прыкладу возьмем Рудакоўскі сельсавет (можна браць любы сельсавет, справа аднолькавая). Згодна кантрактацыйных дагавораў, працоўныя аднаасобнікі павінны здаць 7255 кілёграм ільнанасеньня, з якога ў жніўні—603 кілёграма Кулацка - заможная частка павінна здаць усяго 710 кілё, але-ж у жніўні—НІВОДНАГА КІЛЁГРАМА. Па Міхалёўскім сельсавеце з 801 кілё, цьвёрдазаданьніі ў жніўні, згодна апэрацыйнага пляну, не здаюць ніводнага кілё. Наогул такая справа па ўсіх сельсаветах.

На запытаньне кіраўніку канторы Загатільну т. Стальмакову чаму гэта так здарылася, апошні ня змог адказаць. Мы лічым, што гэта зроблена не памылкова, а сьвядома.

За гэта патураньне кулацкім элемэнтам, Стальмакоў павінен быць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

СУРГАНАЎ.

Папярэдзіць пагрозу зрыву апрацоўкі ільну.

Лён пасьпявае. У некаторых брыгадах калгасу імя ЧАРВЯКОВА, Віцебскага сельсавета, прыступілі да церабленьня яго.

Але-ж, калі прыглядзецца, як падрых таваліся да яго апрацоўкі, складецца ўражаньне, што быццам лён пачаў толькі квітнець.

У трэцяй брыгадзе яшчэ да гэтага часу няма падрыхтаванай ёўні і бані, дзе лён будуць сушыць і апрацоўваць. Ніводная брыгада яшчэ не прыступі а да загатоўкі дроў для сушкі ільну. Машыны ня прыведзены ў гатоўнасьць. Ільномялкі раскіданы па ўсім калгасе, ніхто гэтымі справамі ня цікавіцца.

Праўленьню калгасу і партыйнай ячэйцы трэба зараз жа ўзяцца за падрыхтоўку да пераапрацоўкі ільнатрасты. Трэба памятаць, што лён—тэхнічная культура і што ад яго своечасовага церабленьня і якасьці пярвічнай апрацоўкі залежыць якасьць прадукцыі.

БЕЛЕНЬКІ.

ЖНІВЕНЬСКІ ПЛЯН ВЫКАНАН НА 144 ПРОЦ.

Калгасы ШУМНЯНСКАГА сельсавету перавыканалі жнівеньскі плян загатовак ільнанасеньня. Замест 595 кілёграм, здадзена 857, што складае 144 проц. жнівеньскага пляну. У бліжэйшыя дні калгасьнікі абавязваюцца выканаць увесь гадавы плян па здачы ільнанасеньня дзяржаве.

Калгас „Камунар"—перадавік ільнозагатовак.

Калгас «Камунар» адзін з першых па Старасельскім сельсавеце прыступіў да масавай здачы ільнанасеньня па кантрактацыйным дагаворы. 1 верасьня калгас здаў абозам ільнанасеньне, выканаўшы гадавы плян на 92,3 проц. Узмоцненымі тэмпамі калгас рыхтуецца да пераапрацоўкі ільнатрасты. Калгасьнікі мяркуюць у самы кароткі час здаць дзяржаве ўсё ільновалакно, якое, згодна кантрактацыйнага дагавору, прылічваецца з калгасу.

Грынман.

Хаджэньне па муках АЛЬБО як Загатлён наладзіў прыёмку тэхкультур.

1 верасьня я вазіў у горад здаваць ільнанасеньне. Раней чым паехаць на склад, я накіраваўся ў кантору Загатільну, каб запытацца куды весьці насеньне. Адтуль мяне накіравалі на Арлоўскую вуліцу да складу № 36. Прыехаўшы да гэтага складу і даремна прастаяўшы дзьве гадзіны (чакаў пакуль прыдзе загадчык), я зноў пайшоў у кантору Загатільну. Там мяне паслалі на другую вуліцу, а на якую—яны і самі ня ведаюць. Гэтую вуліцу мне прышлося доўга шукаць з дапамогай міліцыянэра. Страціўшы шмат часу, я ледзь знайшоў гэты пункт і толькі а 8 гадзіне ўвечары сваё ільнонасеньне здаў.

Я лічу, што такую пастаноўку работы Загатільну нельга інакш назваць, як прамое жаданьне сарваць загатоўкі ільнонасеньня. Гэтым пытаньнем павінна заняцца пракуратура.

Калгасьнік ІГНАЦЬЦЕЎ.

Калгас «Камунар», Старасельскага сельсавета.

11 верасьня, а 5 гадзіне ўвечары ў ГК КП(б)Б адбудзецца **НАРАДА ДЫРЭКТАРОЎ І СЭКРАТАРОЎ ПАРТЫЙНЫХ І КАМСАМОЛЬСКІХ ЯЧЭЕК, ВНУ, РАБФАКАЎ, ТЭХНІКУМАЎ, ВЯЧЭРНІХ РАБОЧЫХ КАМБІНАТАЎ І ФЗВ**

па пытаньнях:

1. Вынікі падрыхтоўкі да навучальнага году і пачатак навучальнага году.

2. Аб падрыхтоўцы да гарадзкой канфэрэнцыі рабочай моладзі па пытаньні навучаньня і навучальнага году.

Культпроп ГК КП(б)Б.
Аддзел асьветы ГК КСМ.

Сёньня, 10 верасьня, а 7-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні гаркома ЛКСМБ адбудзецца **нарада культпропаў калектываў і ячэек КСМ** па пытаньні зімовай палітвучобы.

Гарком ЛКСМБ.

УСЕ КЛІЕНТЫ ДЗЯРЖБАНКУ, якія маюць разьліковыя або бягучыя рахункі, ПАВІННЫ ДА 15 ВЕРАСЬНЯ Г. Г. ПРАДСТАВІЦЬ у аддзяленьне Дзяржбанку КАСАВЫЯ ПЛЯНЫ НА 4 КВАРТАЛ 1933 году ў месячным разрэзе.
СПЭЦБАНКІ прадстаўляюць ЗВОДНЫ КАСПЛЯН па сваёй клієнтуры, а гарфа—зводны па УМБ і сельбюджэце.
Непрадстаўленьне касплянаў пацягне спыненьне выдачы грошай.
Аддзяленьне Дзяржбанку.
844—2—1

ВІЦЕБСКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ БЕЛЭНЭРГАКАМБІНАТУ даводзіць да ведама насельніцтва гораду, што ПРЫЁМ ЗАЯЎ НА НОВАЕ ЎКЛЮЧЭНЬНЕ ЭЛЕКТРАЭНЭРГІІ СПЫНЕН ДА 1 ліпеня 1934 г., а таксама папярэджваюцца спажыўцы, якія ня будуць сваячасова ўнасіць плату, што падача электраэнэргіі будзе спынена без далейшага аднаўленьня.
838—3—2

ЦАГЕЛЬНЫ ЗАВОД № 5 „БЕЛБУДМАТАР'ЯЛ" АДПУСКАЕ ўсім будаўнічым арганізацыям, саўгасам, калгасам і іншым прадпрыемствам цэглу без нарадаў, у неабмежаванай колькасьці.
842—2—2

ВІЦЕБСКІ РАБФАК ПРЫ МЕНСКІМ ІНСТЫТУЦЕ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ АБВЯШЧАЕ
ПРЫЁМ НА ЎСЕ КУРСЫ
на 1933—34 навучальны год
На 1, 2, 3 і 4ы выпускны курс вячэрняга рабфаку прымаюцца рабочыя без адрыву ад вытворчасьці, а таксама калгасьнікі і чырвонаармейцы. На 1 курсе будзе зьменная група. Утвараецца прыём таксама на 4 паралельны дзённы курс.
На Пралетарска-слабадзкі філіял (Маркаўшчына) заявы прымаюцца непасрэдна ў канцылярыі фабрычна - завадзкой 10-годкі. Заявы з заверанай анкетай і даведкай аб месцы працы дасылаць на імя рабфака: Ленінская, 30. Анкеты і ўсе даведкі аб прыёме можна атрымаць у канцылярыі. Іспыты адбываюцца з 3 па 12 верасьня.
628—11—8

Кватэру ў Віцебску мяняю на кватэру ці пакой ў Менску. Звяніць па тэлеф. 1-73.

ВІЦЕБСКІ ГАРСАВЕТ купляе ездавых коняй. Жадаючыя прадаць коняй павінны зьвярнуцца ў гарсавет (Савецкая, 32, пакой 27 і 28).
845—3—1.

На пабудове хлебазавода патрабуюцца: пячнікі, сьлюсары і чорнарабочыя. Зварочвацца: Саратаўская 25, да начальніка мантажа.
848—1—1

Патрабуецца спэцыяліст (інжынэр ці тэхнік) па кампрэсарных установках. З прапановамі зьвяртацца ў ВАДАКАНАЛ—УРЫЦКАЯ 27, тэл. 4-94.
837—2—2

Прадаецца дом па Гошпітальнай вул., № 28.
За даведкамі зварочвацца ў кантору ЛСПО ад 9 да 4 гадз. дня.

Гарліт № 12. Друкарня „Камунара", Вальмавідская, 10. Нам. адк. рэдактара У. М. ВЕРЖБАЛОВІЧ.